Уладзімір Мароз

# КРЫЖЫ НА РОСТАНЯХ

Кніга вершаў

Уладзімір Мароз

# КРЫЖЫ НА РОСТАНЯХ

Кніга вершаў

Мінск
Выдавец
Зміцер Колас

2014

УДК 821.161.3-1
ББК 84(4Беи)-5
М28

Мастак Марына Мароз.

Фота Аляксандра Уласава.

З удзячнасцю жонцы маёй Вользе і дачцэ Марыне.

**Мароз**, У. В.

М28 Крыжы на ростанях : кніга вершаў / Уладзімір Мароз. — Мінск : Зміцер Колас, 2014.— 128 с.

ISBN 978-985-6992-47-9

У новай кнізе Уладзімір Мароз ідзе горнімі і дольнімі шляхамі Святой Зямлі і сваёй роднай Беларусі. Вершы вылучаюцца адметнай інтанацыяй, шчырасцю пачуцця, філасофскай заглыбленасцю.

Адрасуецца шырокай чытацкай аўдыторыі.

УДК 821.161.3-1
ББК 84(4Беи)-5

**ISBN 978-985-6992-47-9**

© Мароз У. В., 2014.
© Мароз М. У., ілюстрацыі, 2014.
© Афармленне. Выдавец Зміцер Колас, 2014.

# ГОРНІЯ СКРЫЖАЛІ

## Іерусалімская нізка

## Мая Святая Зямля

Яе ведаў, спрадвечную, з кніг,
Поўных цудаў дзівосных і дзеяў,
Дзе іскрылася казка ці міф,
Што Гасподзь дабрадатна пасеяў.

Я быў тут — адначасна і там,
І далёка нібыта, а блізка.
Паднябесны прасветлены храм,
Чалавецтва святая калыска.

З таго часу — жаданне дапяць
Жыватворных мясцін на планеце.
Ды нікому не дадзена знаць,
Як шляхі нашы лягуць па свеце.

Усё роўна душою імкнуў,
У малітве прасіў падсвядома.
Браму светлую ключ адамкнуў —
Я нарэшце вярнуўся дадому.

Гэтых тысяч гадоў не сплыло —
Спрычыніўся да справаў Хрыстовых.
Тут лунала любові крыло
Запаветам чаканым і новым.

Я хаджу праайчынай сваёй,
Дзе бруіць хрысціянства крыніца.
Незнаёма-знаёмай зямлёй
Аніяк не магу натаніцца.

# Калодзеж Марыі

Адвеку мы прагнем жыццёвай спатолі,
Жадаем напіцца жывое вады,
Пазбыцца пякучай атрутнай юдолі,
Адпрэчыць наўсцяж непазбежнасць бяды.

Сасмяглых калодзеж Марыі чакае.
За чыстай вадою ішла з небыцця
Дзяўчына, што вестку з нябёс атрымае,
Нарodзіць для нас беззаганна дзіця.

Вось тут перастрэў яе з белай лілеяй
Зусім неспадзеў арханёл Гаўрыіл.
І свет набрыняў прычаканай надзеяй,
Прыняць непазбежнае сталася сіл.

Міг згоды анёлу, цнатлівасць зачацця,
Адкуплены новаю Еваю грэх.
Далёка яшчэ прадчуванне распяцця,
І доўгаю будзе дарога наверх.

Падзякую Богу, што даў прычасціцца, –
Найглыбшы калодзеж адкрыў Назарэт.
Струменяць дасёння святыя крыніцы,
Чыёю вадою ратуецца свет.

## Віфлеемская зорка

Цямрэчай падманнай кіруем бязмэтна,
Хоць зорак у высях – мяхамі збірай.
Так дойдзем да краю жыцця непрыкметна,
Нябыт пахавае нязнойдзены рай.

На гэтых шляхах і сцюдзёна, і золка,
Дарога без выйсця – хоць плач, хоць крычы.
Ратунак адзін – Віфлеемская зорка,
Што яркай паходняй паўстала ў начы.

Хрыстос нарадзіўся – нябёсы святкуюць,
Напятасць душы адгукнулася зноў.
Крануўшы лагодна струну трапяткую,
Наўсцяж разлілася над светам любоў.

Заззяла спатольна прадвесніца рання,
Пачатак браў першы евангельскі дзень.
Пакліканым людзям – жывое адхланне,
Вялікае шчасце вяртання надзей.

Няхай яе сёння не згледзець на небе –
Святло гэтай зоркі ўжо не патушыць.
Яно ў нашых сэрцах пры кожнай патрэбе,
Каб ведаць напраўду, чаму варта жыць.

## Іудзейская пустэльня

Не бойся спякоты пякельнай –
Для Госпада шлях падрыхтуй.
Застанься сам насам з пустэльняй,
Душу супакоем ратуй.

Абрысы пяшчотныя мройна
Акрэсляць табе іншасвет.
Патрэба смыліць незагойна
Наяве пачуць Запавет.

Праз голас Таго, хто ў пустэльні
Стагоддзямі кліча ўсіх нас.
Ды людзям не рупіць, каб вельмі,
Жаданне паслухаць той сказ.

На схіле гары памаліся,
Каб покліч душою пачуць.
Спатольнасць злагодзіцца ў высях,
Бязладдзя сплыве каламуць.

Між дольнім і горнім узмежкі
Адолееш сёння адзін.
І простымі зробяцца сцежкі –
За Госпадам следам ідзі.

# Хрышчэнне ў Іярдане

Зялёнай вады Іярдана
Амаль незаўважная плынь.
Дабраўся – запозна, зарана? –
Сумненні дарэшты адкінь.

Аддайся хрышчэнню напраўдзе,
Хоць маеш гадоў як аддаць.
Бярэ хваласпеў поўнаўладдзе,
Абраду бруіць дабрадаць.

Прасветлыя словы малітвы
Пачуюць ракі берагі.
Няспынная повязь лавітвы,
Абранасці час дарагі.

Належна ў ваду акуніся –
Сплывуць даравальна грахі.
Віно запаветнае з высяў
У новыя льецца мяхі.

Ачысціць душу ад спакусаў
Малітва аб боскіх дарах.
Пазбавіць ліхіх пeратрусаў,
Паверне на праведны шлях.

Другое на свет нараджэнне
Штуршок дасць – па-новаму жыць.
Пакліканы ты на служэнне,
І так наканавана – быць.

## Гара Спакусы

Іудзейскай пустэльні хрыбты-міражы,
Явай толькі гара ў спазнаваемым свеце,
Дзе пастом і малітвай Гасподзь наш пражыў
Сорак дзён і начэй па сваім запавеце.

На тым месцы святыняй цяпер манастыр,
Са скалы вырастае наўсцяж цудадзейна.
Храбусціць пад нагамі размораны жвір,
Нас угору падпіхвае пругка, надзейна.

Перастрэне царква, грот-капліца ў скале,
След Ягонай нагі нам гара адкрывае.
Узрушэнне, спякота і пот на ілбе,
Які матушка хустачкай мне выцірае.

Хваласпеў скалане падскляпенную ціш,
Пошум даўніх стагоддзяў наяве пачуеш.
Пасярэдзіне свету ў адхланні стаіш,
Перад камнем укленчыш, адбітак цалуеш.

Потым зноў серпанцін да вяршыні гары,
Хвіляй немачнай здасца – няма болей сілы.
Ды Гасподзь не пакіне цябе да пары,
Як сваімі памкненнямі ты Яму мілы.

Тут агледзь, як і Ён, далягляд з вышыні –
Царствы свету відаць, іх падманная слава.
Хай спакуса не пусціць свае карані,
Толькі Богу служыць – чалавечая справа.

## Камяні і хлеб

Як зрабіцца камяням хлябамі? –
Сэнсу не даўмеешся наўпрост.
За даламі вобраз, за гарамі –
Да Святой зямлі будуй свой мост.

Краявід паўстане тут дарэчы,
Аб якім спакуснік гаварыў:
Як хлябы духмяныя, што з печы,
Камянюкі-боханы ў гары.

Уляпіла іх у схіл прырода,
У траву, сярод някідкіх дрэў.
Цуд явіць выдатная нагода,
Хто бязмежнасць паказаць хацеў.

Наямося гэтымі хлябамі,
І не трэба пот свой праліваць.
Рай зямны пабратаецца з намі,
Чалавеку проста дабрадаць.

Ды не варта блытацца ў аблудзе –
Чуйна слухай Госпада свайго.
Не адзіным хлебам жыцьмець будзем,
Але ўсякім словам ад Яго.

## Цуд у Кане Галілейскай

Першы цуд – аніяк не чаканы, –
Тут вада зараз стане віном.
Ты сягоння на свята абраны
За спрадвечным вясельным сталом.

Узгадаеш сябе маладога,
І любоўю асвечаны шлюб.
Дай нам, Госпадзі, шчасця зямнога,
Каб вянец да вянца клаўся ў зруб.

Каралеўна твая маладая
Гэта шчасце табе прынясе.
Карагодзіць сябрына людская –
На вяселле пакліканы ўсе.

Тут і Ён пабываў непрыкметна,
З чалавекамі радасць дзяліў.
Не скончаўся напой запаветна
Для вясельнікаў проста наўздзіў.

Асвячу я віно ў светлым храме,
Дзе каменны стаіць ваданос.
Повязь роднасці тчэцца між намі,
Стануць яваю водбліскі кроз.

Не адпрэчыць дадому вяртанне
Гэткі стан – ён ужо да канца.
Вып'ем сёння з табой за каханне,
Быццам толькі вось-вось з-пад вянца.

## Светлы след

Галілейскае мора, лавітва
Чалавечых разгубленых душ.
Вечаровай парою малітва...
Стан суладдзя няўзнак не паруш.

Лёгкакрылы спакой – як адхланне,
Што дае спаконвечнасць вады.
Таямніц захаваць пакліканне
Ёй было праз вякі і гады.

Убірай водар любасці, дыхай,
Слухай чуйна святы запавет.
Раптам матушка мовіла ціха:
"Тут часінай відаць светлы след.

Дзе ішоў па вадзе, як пасуху
Ён да вучняў сваіх напрасткі..."
Узрушэнне засмяглага духу,
Добрай весткі настрой трапяткі.

Цудадзейна адкрыліся вочы –
Я пабачыў сцяжынку святла,
Што істужкай у прыцемках ночы
Па прыціхлай вадзе пралягла.

Вось ён, след!
Так у цуд я паверыў,
Ткала повязь нябачная ніць.
Горніх цнот адчыніліся дзверы –
Дзеля гэтага варта і жыць.

## Гара Фавор

Пераўтварэнне,
Адкрыццё
Святла жывога, незямнога.
Бліскучай белі праліццё,
З аблокаў лёгкіх голас Бога.

Ва ўбранні з кветак стрэшкі тры
Для Ісуса і прарокаў.
Турботаў пыл з душы сатры –
Ты ад жыцця за колькі крокаў.

Глядзі на сонца, не міргні, –
У ім гарыць Яго аблічча.
Не бойся знікнуць у агні,
Калі Гасподзь цябе пакліча.

Гара падніме ў іншы свет,
Загояцца былыя раны.
Тут адкрываецца як след,
Пакліканы хто і абраны.

Адтае сэрца ў вышыні –
Рукой дастаць сінечы неба.
Стаіць гара, і дзень пры дні
Святлу Фавора верыць трэба.

## Іерусалім

Зямнымі шляхамі Збавіцеля
Абраны імкнецца прайсці.
Падножжа нябеснай авіцелі
Убачыць хоць раз у жыцці.

Пагрукайце – будзе адчынена,
На шчырасць даецца адказ.
Тут зверхнасць любові не спынена,
Чакае знямоажаных нас.

Дзе горад святы адкрываецца
Як Божае любасці дар,
Там сонца ўвесь дзень не хаваецца,
Ні ветру няма, ані хмар.

Тут час не ўладар над стагоддзямі,
Адпрэчвае тайнай гады.
Завулкаў крывымі разводдзямі
Па бруку ідзеш, як тады.

Вітае дзіцячай дарослацю,
Падлашчвае раем зямным.
Жыве гамaной дый узнёслацю
Нябесны Іерусалім.

Здзіўлення няма ад нязнанасці –
Усе мы тут дома, свае.
Чаканасці і нечаканасці
Ён з лёгкай душой раздае.

## Елеонская гара

З даліны не згледзіш нічога –
Угору нястомна імкні.
Вядзе пакручаста дарога
Праз ночы і шэрыя дні.

Гара Елеонская кліча,
Дзе водсвет евангельскіх слоў
Яго праяўляе аблічча,
Адпрэчвае поступ гадоў.

Каменныя сцежкі і схілы
Захоўваюць дайна сляды.
Казанні Твае, Божа мілы,
Яшчэ не вястуюць бяды.

І ўсё ж – прадчуванне пакутаў,
І здрада як тут, пры дзвярах.
Але да зямлі не прыкуты,
Хто верыць душой, не за страх.

Наўсцяж падтрымае Ўзнясенне,
Спатоліць разгадкаю цуд.
Ад цягі зямнога збавенне
Якраз адбываецца тут.

Угору ідзі праз аблуду –
Адвечнае стане тваім.
Убачу – і больш не забуду
Цябе, мой Іерусалім.

## Гефсіманскі сад

Кроплі поту як кроплі крыві
Звеставальна сцякаюць па твары.
Божа, Сына свайго блаславі
Годна вытрываць долю ахвяры.

Ён у роспачы просіць Цябе:
"Пранясі чашу гэтую міма!"
Але час незваротнасцю б'е,
Справа страшная несупыніма.

Да смяротнага смутку душы
Дадаецца палон адзіноты,
Дзе надзея й адчай — спарышы
Непазбыўнай і скрушнай самоты.

Толькі дрэвы цяпер разам з Ім
Ля падножжа гары Елеонскай.
Ноч палечыць спакоем сваім,
Але дзея не стане менш жорсткай.

Шлях крыжовы, ён з намі спрадвек —
Тут прадасць Яго здраднік Іуда.
Ці спасцігне калі чалавек,
Што багацці зямныя — аблуда?

Дрэвы ў садзе і сёння стаяць.
Таямніцай сівой ахінуты.
Ціхаплынна лістотай шумяць,
Пра Ягоныя сведчаць пакуты.

# Вязніца ў Прэторыі

Па вузенькіх сходах у целе скалы,
Дзе двум размінуцца амаль немагчыма,
Спускаюся долу з высокай гары,
Нязвыклыя лёхі ўбіраю вачыма.

За кратамі цемніцца вязніца-грот,
Апошнюю ноч дзе правёў Ён зямную.
Няпраўда і сёння збірае ўмалот –
Агеньчыкам свечкі стагоддзі знітую.

Узрушыцца сум на душы ад таго,
Што заўтра народ адняволіць Вараву,
Злачынцу адпусціць наўсцяж, а Яго
Аддасць на знявагу, на здзек і расправу.

І Той, хто за праўду цямніцу спазнаў,
Хто словы любові прынёс неатрутна,
Пакажа нам шлях найвышэйшых праяў –
Свой крыж панясе на Галгофу пакутна.

## Вуліца Смутку

Свой знак на скрыжалях запішам,
Пачуцці папросяцца ў верш.
Па вуліцы Смутку за крыжам,
Ці з крыжам спякотна ідзеш.

Прыпынкі мінае сябрына,
У кожнага думкі свае.
Па вуліцы Божага Сына
Гасподзь нам прайсціся дае.

У свет дабрадатнасці дзверы
Адчынены сёння для нас.
На вуліцы шчырае Веры
Знайдзі на пытанні адказ.

Ураз Дабравесця падзеі
Наяве ў душы ажывуць.
Па вуліцы яснай Надзеі
Да шчасця ільга даімкнуць.

Пазбыцца пякучай юдолі,
Трывогаў, пакутаў і слёз.
На вуліцы светлай Любові,
Якую для нас Ён прынёс.

Наперадзе, толькі не збочыць,
Галгофа стамлёна стаіць.
Па вуліцы Радасці крочыць,
Якой накanoвана быць.

# Храм Святой Дамавіны

Як Дабравесця радкі не чытай-перачытвай,
Цяжка ўявіць, адбылося спрадвечнае дзе.
Толькі тады, як патрапіш у вырай з малітвай —
Сведкам абраным евангельскіх станеш падзей.

Храм Дамавіны Гасподняй — жывая спаруда,
Сцены якой таямніц адбіваюць святло.
Праз увахол да святынь далучышся цуда,
Дзе мітусня і будзённасць згараюць на тло.

Тут усё побач: Галгофа, адонная крушня,
Камень-пліта, дзе памазана цела Яго,
І дамавіна-пячора ў скале непарушнай,
Дзе запалаў Уваскрэсення вечны агонь.

Тут пуп зямлі, ты здабыў гэты грунт пад нагамі,
Кропку адліку, пачатак дарог у жыцці.
Прага любові наўсцяж завалодае намі,
З ёю ў душы будзе лёгка й шчасліва ісці.

Людзі наўкола не рушаць тваёй адзіноты,
З храмам сам-насам разгортваеш згадак сувой,
Прагна ўбіраеш ласкавыя горнія цноты —
Чуйна адсёння яны назаўсёды з табой.

## Галгофа

Дзе дольнія і горнія шляхі
Зліваюцца ў адзін прасветлы шлях –
Стаіць Галгофа на сямі вятрах,
Адпрэчвае імклівыя вякі.

Знямажаны ўзыходзіў Ён сюды,
Данёс з пакораю свой цяжкі крыж.
Натоўп кіпеў, як нелюбві спарыш,
Таптаў Яго апошнія сляды.

Крычала зайздрасць люта: "Укрыжуй!
Хай кроў на дзецях нашых і на нас!"
На здзек гучалі словы ў гэты час:
"Калі Сын Божы, хоць Сябе ўратуй!"

Адзін Ён ведаў, што ўратуе свет,
Дарогу прэч пакажа ад спакус.
Паўстала цемра, стаўся землятрус –
Адлік пачаў так Новы запавет.

Стаіць Галгофа на сямі вятрах,
Пакутаў сведка праз усе вякі.
Гарыць агеньчык свечкі трапяткі,
У Маці Божай смутак у вачах.

## Пліта памазання

Не без праведных свет наш людзей –
Так было і так будзе навечна.
Да Пілата Іосіф ідзе
З шчырай просьбай сваёю сардэчнай.

Ісуса здымае з крыжа –
Даць спачын у каменнай грабніцы.
У жанчын тонка вейкі дрыжаць,
Яны ціха прыйшлі пакланіцца.

Шматпакутнае цела ляжыць,
Пахкай міррай яго абціраюць.
Праз вякі працякуць капяжы,
Пра жалобу штораз нагадаюць.

Водар мірры наўкола бруіць,
Ад пліты разыходзяцца хвалі.
Не ірвецца стагоддзямі ніць,
Хоць не раз перарваць спрабавалі.

Твар абмыю тым пахам святым,
За Яго памалюся пакуты.
Камень промнем блішчыць залатым,
Непагасным агнём ахінуты.

Стануць светлымі думкі твае,
Ад цяжару прыходзіць збавенне.
Так Гасподзь табе сілы дае,
На жыццёвыя дзеі натхненне.

# Дамавіна Хрыста

У капліцы згадай аб крыжы –
І жыццёвай набудзецца сілы.
Скінь свой камень з напятай душы,
Як адвалены ён ад магілы.

На тым камені стрэне анёл
З весткай аб Уваскрэсанні вечным.
Дзеяй светлаю зняты праклён,
Што над родам вісеў чалавечым.

Сэнсу словаў адкрыецца цуд:
"Не шукай Ісуса жывога
Сярод мёртвых. Няма Яго тут".
Так надзейна прыходзіць падмога.

Ля Хрыстовай укленчу пліты,
Прашапчу свае словы малітвы.
Паяднанасці час залаты,
Са святымі скрыжалямі злітнасць.

Кроў ціхутка выстуквае ў скронь,
Прага вернасці, будзь спаталёнай!
І святы дабрадатны агонь –
Напамінак любові Ягонай.

## Святы агонь

Праз ноч у чаканні стаіш,
Глытаеш напятую ціш.
У храме Святой Дамавіны
Усе свае ўспомніш правіны.

Сягоння адбудзецца цуд –
Твайму малавер'ю прысуд.
Прадвесцем ідуць бліскавіцы,
Але не даюць наталіцца.

Нарэшце прызначаны час
Да неба пакліча ўсіх нас.
На свечках агонь затрапеча –
Святло сустракай, чалавеча.

Святы дабрадатны агонь
Ні твар не абпаліць, ні скронь.
Абмыешся ім, як вадою –
Гаючай, жывой, маладою.

Хрыстос уваскрэсне ізноў,
Над светам – адзіна любоў.
Істоту запоўніць дазвання
Святая часіна яднання.

Красуйся, Іерусалім!
Агнём непагасным тваім
Цяпер ты ў душы назаўсёды –
Праз радасці нашы й нягоды.

## Прыцягненне

Калі смыліць бязбожнасць веку,
Калі няўтульна спрэс парой, –
Куды падацца чалавеку
З яго зняверанай душой?

Параду вымаўлю такую,
Калі на ростанях стаім:
Пакінь сваю юдоль зямную –
Кіруйся ў Іерусалім.

Найпенкны гэта паратунак:
Дастаць святла Святой зямлі,
Дзе ўсім абраным ёсць прытулак,
Каго дарогі прывялі.

Не трэба нам імпэт прарочы –
Паўстане явай Запавет.
Табе адкрыецца на вочы
Любові Божай светлы след.

Спрадвеку тут перапляліся
Зямныя, горнія шляхі.
Залатвіцца спакой у высях,
Адпусцяцца твае грахі.

Адно кіруйся не турыстам,
Без мітуслівасці гадзін.
Як пілігрым, з душою чыстай
На пакліканне ты прыдзі.

# КРЫЖЫ НА РОСТАНЯХ

## Вянок санетаў

1

Мяжа вякоў – прымай наканаванне,
Што ў прышласць браць – старанна выбірай.
Найперш любоў Яго перахавай,
Яна адна – тваё выратаванне.

Пакінь дзяцінства незабыўны рай,
За ўсе нягоды лепшае адхланне.
Праз перaтрусы пранясі каханне,
Адданасць ніве, што дала ўраджай.

Тады, як час бязлітасна праб'е –
Сумненняў тлум ужо міне цябе,
Падымеш погляд ад зямлі на зоры.

Вось прыклад твой – як смела, не за страх,
Жадае піць бязмежнае прасторы
Пад небам звонкім вольнакрылы птах.

## 2

Пад небам звонкім вольнакрылы птах –
Жагнае даль узмахам крылаў бусел.
Лунае гожы сімвал Беларусі,
Адбітак ў спелых сонечных лугах.

На маляўнічым кветкавым абрусе
Аддамся лету ў мяккіх мурагах.
Блакіт бяздонны нам адзіны дах –
З табою ў высі, статны, паімкнуся.

Лясы мае агледзець і палі,
Гаспадаром адбыцца на зямлі –
Заўсёды сейбіта чакае праца.

Пакуль магу і верыць, і змагацца,
На жыццядайнасць адвяду замах.
Імпэт з гадамі ў сэрцы не ачах.

## 3

Імпэт з гадамі ў сэрцы не ачах –
Кранаюць неба дужыя галіны,
Вітаюць весні гоман жураўліны.
Там Нёман плешча ў родных берагах.

Пясок скрыпеў балюча на зубах,
Спраўлялі рэй бяздомныя гадзіны.
Адчай каўталі за свае правіны,
Кіпела цемра блізка пры дзвярах.

Калі наскрозь задушліва і горка,
Над котлішчам мая свяціла зорка,
Чароўнай явай праясняла зрок.

І тым было акрэслена вяртанне,
Жаданне выстаяць зарука і зарок.
Эпохі новай чуеш звеставанне.

## 4

Эпохі новай чуеш звеставанне,
Шчаслівым дарам — радасць і спакой.
Шчымлівы момант наступае твой —
З дзіцячай мрояй поўнае яднанне.

Абхопіць пругка роснае світанне,
Разбудзіць цёплай летняю парой.
Нахлыне зорных, ясных думак рой —
Пяшчотных слоў натхнёных абяцанне.

Стаіць на ўзлеску хутар — дзедаў дом,
Вады гаючай каўтануць нагбом —
Зрабіцца дужым спраўдзіцца жаданне.

Чужым-сваім бясхатнікам ніяк
Не разгадаць быцця высокі знак.
Збавення побач — сум і занядбанне.

## 5

Збавення побач — сум і занядбанне,
Старыя дрэвы, дзе ўздымаўся храм.
Бурыў яго тутэйшы злыдзень-хам,
Якому памяць выбілі дазвання.

Са мной заўсёды горнае літанне,
Анёлаў спевы й сёння чую там.
Свае святыні аддавалі псам,
Забыўшы сэнс зямнога існавання.

Глядзі цяпер, дзе сцішыўся народ,
Бракуе гарту перабрацца ўброд —
Па той бок брамы любасці застаўся.

Не змог узвесці непарушны гмах,
І шанцам гонар меціць не скарыстаўся —
Надзея й роспач разам у вачах.

## 6

Надзея й роспач разам у вачах,
Сплываюць дні маркотна, незаўважна.
Суворы вузел хто цяпер развяжа,
Даўнейшай моцы як няма ў руках?

Паразаў крыўдных горыч на губах –
Шукай валун, што ў кут падмурку ляжа.
Паданне даўняе табе ён перакажа
Аб затаптаных Госпада слядах.

Часіне мірнай мы заўсёды рады,
Хапіла ўдосталь ненажэрных звадак,
Не тчэцца повязь, дзе разрыўна-тонка.

У парыжэлых сцішаных снягах
Прыціхла ў скрусе бедная старонка
На еўрапейскіх на сямі вятрах.

7

На еўрапейскіх на сямі вятрах
Няўтульнасць чуецца над цэлым краем,
Імжа сляпіцай лезе ў твар ратаям,
Аслаблых воляй апануе жах.

Дзе не ступіць нагою — продкаў прах,
Але пра тое ведаць не жадаем.
Апошні дзень нібы — наўсцяж гуляем,
Згубілі бел-чырвона-белы сцяг.

І не чуваць нястрымнае Пагоні,
І не пульсуе кроў амаль у скроні —
Жывы ці мёртвы ты, мой браце, ёсць?

Таго чакае забыццё й кананне,
Хто ў сваім доме як часовы госць.
Спакусы зла струменіць скрыжаванне.

## 8

Спакусы зла струменіць скрыжаванне,
Падманны бляск мільёнnых гарадоў.
Пашлюбавацца кожны тут гатоў –
Бярэ ў абдымкі прывіднае ззянне.

Удар пад грудзі – збітае дыханне,
Ідзе заўзята малацьба снапоў.
Дзіравы ўшчэнт нябесны наш пакроў,
Няўмольны лёс прадвызначыў закланне.

Жалобны баль спраўляецца ўгары,
Памінкі, дружа, што ні гавары –
Саміх сябе мы вусцішна хаваем.

І гвалт, і здзек з пакораю трываем,
У жорнах пекла змеле нас Малох.
Як папусціўся на такое Бог?

## 9

Як папусціўся на такое Бог?
Няўсцешны боль не адпускае грудзі.
Як да пакутаў дажыліся людзі,
Наўзбоч шляхоў раскіданы гарох?

Сярод расстайных поклічных дарог,
Найвузкай тая, што да веры будзе.
Але яе не згледзець у аблудзе,
Каб горніх цнот пераступіць парог.

Такі няўсцешны напінае скутак,
Трывожна сэрца праціннае смутак –
Працерабіся праз смуродны смог.

За канфармізм дастанеш дараванне,
Няўзнак само адступіцца пытанне:
Хто Дабрадаці вышняй не збярог?

## 10

Хто Дабрадаці вышняй не збярог?
Зарніцы-згадкі згаслі залатыя.
Жывіцу нашу сцягвалі другія –
Краіне любай большала трывог.

Яе нутро сталёвы рваў нарог,
І плоць дзялілі за часы ліхія.
Крышылі жорстка жыцці маладыя,
Адужаць бездараж ніхто не мог.

Апошні раз калі давалі здачы? –
Забытай славай не здабыць удачы,
Ваярскі чын рассыпаўся, прапаў.

Ды хто штораз аб ім напамінаў?
Вось і цяпер падобнае выходзіць:
Брыдзём у прыцемках па крохкім лёдзе.

## 11

Брыдзём у прыцемках па крохкім лёдзе,
Але не вечны ў свеце гэты рух.
Карэннай плыні ажывае дух
У снегавейным стомленым паходзе.

Згрызотаў лісце адляціць як пух,
Брыдота заўтра цьмяная пяройдзе.
Здранцвенне соннае адпрэчыць: годзе!
Касцёр раздуць, пакуль ён не патух,

Складзём супольна сілы наастачу,
Развяжам конча цяжкую задачу,
Няволі згубнай вывернем глыжы.

Давершым дружна талакою хату –
Бруіць работа весела, заўзята.
Радзінны кут, ачуцца памажы.

## 12

Радзінны кут, ачуцца памажы,
Навалы чорнай перастрэць нашэсце.
Спагады боскае дастаць нарэшце,
Ачысціць цела ад грахоў іржы.

Бязвер'е больш не кіне ў віражы –
Званіца кліч дае аб дабравесці.
Не іншым пніся, а сабе давесці,
Што можаш годна ты любіць і жыць.

Таемны скарб адкрыць даўно ўжо трэба,
Прабудзе людства не адзіным хлебам –
Ён запавет пакінуў нам такі.

Закінь за плечы добрых спраў нязводдзе,
Сягай да мэты лёгка напраcткі,
Каб лёс з душою іcнавалі ў згодзе.

## 13

Каб лёс з душою існавалі ў згодзе –
Яго наказам крок звярай штораз.
Мацуй як можацца духоўны звяз,
Не заблудзі ў паганскім карагодзе.

Плаці даніну дарагой свабодзе –
Так аняменню не адолець нас.
Святлом праменіць з покуці абраз,
Свае здабычы д'ябал больш не знойдзе.

Выходзь збіраць старанна камяні,
Паўсюль святыя запалі агні –
Іх не затушыць прыхадзень ніколі.

Спатоляць смагу чыстыя дажджы,
Дарэшты змыюць пачуццё юдолі –
Нас берагуць на ростанях крыжы.

## 14

Нас берагуць на ростанях крыжы —
Бязбожнай смутай быццам не знікалі.
За ноч адну дзівосную паўсталі
Дабраславення промні-капяжы.

Калі наноў агорнуць міражы,
Багацця й славы раскалышуць хвалі,
Жалезны монстр аглушыць звонам сталі —
Не кленч прад ім, не падай, не дрыжы.

Наперад кроч па цаліку без змогі,
Праб'ецца хутка золак перамогі.
Айчына-маці, дзень прадбачу твой.

Табе нясу сваё ахвяраванне,
Ускінься мужна зменлівай парой.
Мяжа вякоў — прымай наканаванне.

## 15

Мяжа вякоў — прымай наканаванне
Пад небам звонкім вольнакрылы птах.
Імпэт з гадамі ў сэрцы не ачах,
Эпохі новай чуеш звеставанне.

Збавення побач — сум і занядбанне,
Надзея й роспач разам у вачах.
На еўрапейскіх на сямі вятрах
Спакусы зла струменіць скрыжаванне.

Як папусціўся на такое Бог,
Хто Дабрадаці вышняй не збярог?
Брыдзём у прыцемках па крохкім лёдзе.

Радзінны кут, ачуцца памажы,
Каб лёс з душою існавалі ў згодзе —
Нас берагуць на ростанях крыжы.

# СВАЯ ТЭРЫТОРЫЯ

## Лірыка

## Шлях да гары

І гэтай дарогай адходжана,
І тую дарогу прайшоў...
Здаецца: вось-вось узыходжанне
Да новых прасветленых слоў.

Але расчаруешся горка
Няздатнасцю дольніх шляхоў.
Наперадзе бачыцца горка –
А ты да яе не дайшоў.

Абтопчаш каля ды наўкола,
Натоўп замінае ісці.
Будзённасці тлумнае кола
Цябе закапае ў трысці.

Ізноў на бальшак выбірацца,
Свой горні гасцінец шукаць.
На ростанях крыж твой, дарадца,
Адзіна імкне падтрымаць.

Нясеш ты яго, як належыць –
Патрэбна да ўзгор'я дайсці.
Ізноў перастрэне бязмежжа,
Бяссэнсіца ў нашым жыцці.

Але ты ўжо можаш, не збочвай,
Ад Моцнага прыклад бяры.
Праз дні і задушныя ночы
Імкніся дайсці да гары.

## Згадкі аб цудзе

Недазволена лезеш у скруху,
Дабрадаці дзе спрэс не відно.
Не прайсці па вадзе, як пасуху –
Сілы цёмныя цягнуць на дно.

Ды і іншыя цуды не здужаць –
Гэта можа тварыць толькі Ён.
Не раскрыецца любасці ружа
Сярод немачы скрыўленых дзён.

Цяжкі скутак чапляецца ўпарта,
Хоць імкнуўся, па шчырасці жыў,
І людзей, нават самых нявартых
Ціхамірнай душою любіў.

Насамрэч так здаецца, не болей –
Палічы ўсе сумленна грахі.
Неабачна свабодную волю
Раскідаў, як салому з страхі.

Прапіваў свае дні залатыя,
Родным людзям цяпла не дадаў.
Пасылае дакоры нямыя
Чарада недаробленых спраў.

Дык якія памкненні аб цудзе? –
Чым хутчэй пакаянне нясі.
Калі верыш – так здарыцца, будзе,
Наастачу даўгі аддасі.

## Тураўскія крыжы

Адвечны шлях свой дабрадаццю высвяці,
Каб да вытокаў дзверы адамкнуць.
Плывуць крыжы Дняпром, плывуць па Прыпяці,
Ад Кіева да Турава імкнуць.

Кіруюць супраць плыні, хоць каменныя —
Такое не спасцігнуць аніяк.
Парой урочнай сілы патаемныя
Явілі продкам Божай волі знак.

Вось каля горада вада ўскрывавела, —
Паганству чэзнуць надышла пара, —
На хрысціянства розум наш направіла
І на сцяжыну вывела дабра.

Князь Тур хрысціўся ля ракі ў калодзежы —
Да нашых дзён паданне даплыло.
На лёс шчаслівы, каб народ у згодзе жыў,
Магутны Божа ўзяў нас пад крыло.

Тых таямніц пабачыць можна сённячы —
Але ў душы без веры каламуць.
Ідзём-брыдзём, гісторыі не помнячы,
Калі ж ізноў крыжы к нам прыплывуць?

## Беларускія мае стагоддзі

Нам стагоддзі-гады, а для Госпада проста імгненні,
Што лістотаю дрэў адлятаюць штораз у нябыт.
У разгадках загадкі праходзяць чаргой пакаленні,
Толькі кожнаму рупіцца ўласны свой выявіць спрыт.

Што да нас, пасля нас — не такая і важная справа,
Свет пачаўся адсюль, значыць, нам вырашаць: быць — не быць.
Самі будзем ісці хоць улева, а хочам — управа,
І нікому няўцям, што ірвецца жыццёвая ніць.

Так ірвалася часта, а то і зусім незваротна,
Недароды, віхуры, падман затапталі сляды.
На расстайных дарогах скавыш падвывае самотна,
Неспазнасць часоў дадае незваротна бяды.

Каб уведаць, адужаць — душы прыкладзі намаганні,
Бо без роду і племені ты неадпрэчна адзін.
Перамогу здабудзь у суровым надчасным змаганні,
А найперш дык самому дай Бог зразумець, чый ты сын.

За тваімі плячыма шыхтуюцца слынныя продкі,
Што зямлю баранілі, ішлі за свой гонар на бой.
Дым Айчыны бруіцца няспынна-нясцерпна салодкі,
Дзеяў слаўных і чынных працяг валадарыць табой.

Быць уласнаму лёсу па сілах удзячным імкнуся,
Што спазнаць даў хоць трохі гісторыі дух трапяткі.
Вы заўсёды са мною, стагоддзі маёй Беларусі,
Гэтак будзе і сёння, і заўтра, і так на вякі.

## Трываласць

Заглушыць яго хочуць – маленне аб родным аб краі,
Папіхаюць туды, дзе жаданага шляху няма.
На адхоне ўтрымацца, бо Ён не даруе адчаю,
Калі ўсё ж паддамося на цемры падступнай падман.

Не бясхатнікі мы, не вандроўнікі – проста паэты,
Нас не трэба шукаць на зняменні расстайных дарог.
Не бяззбройныя мы перад жорсткім бязлітасным светам,
Наша сіла – любоў, аб якой запаветаваў Бог.

Мы нагамі ўраслі ў жыццядайную ніву Айчыны,
Аніхто з чужаніцаў не зможа парваць карані.
Хваласпеў аб радзіме нябесную браму адчыніць,
Насланнё ад ліхога згарыць у пякельным агні.

Цераз словы літання аб любай святой Беларусі
Запавет зберажом, не парвецца гісторыі ніць.
Устаім на адхоне ў шалёным вякоў ператрусе,
Нашу хату давершым і будзем шчасліва там жыць.

# Кардыяграма

Кардыяграма — сардэчная гама,
Лёс яе грае на струнах душы.
Шлях па жыцці — то пагорак, то яма,
Доля з нядоляю спрэс спарышы.

Боль і адхланне, удар і пяшчота —
Толькі чамусьці вось першага больш.
Крышыцца жорстка бяззбройная цнота,
Што можа стацца ад гэтага горш?

Хоць ты зусім не жыві і не думай —
Зло пераможна па свеце ідзе.
Вырвацца з путаў бясконцага тлуму
Здольны-не здольны? — адказ без надзей.

Сэрца баліць — і нікуды не дзецца,
Як не ўцякай на свой хутар жывы.
Хутка зямля ў пекнату апранецца,
Дасць супакой зеляніна травы.

Можа, тады ачуняеш душою,
Хоць на хвілінку суцішыцца кроў.
Светлы праменьчык гуляе з табою —
Злое адпрэчыць адзіна любоў.

## Покліч дарог

Гэты енк цягнікоў, што праз цемрадзь лятуць несупынна,
Гулкі пошчак дарог, што хвалююць хлапечую кроў...
Адпусці, Беларусь, пабадзяцца цікаўнага сына,
Ён праз поклічы колаў даўно да вандровак гатоў.

Тут пабураны замак яшчэ не адкрыў таямніцаў,
І балота Пагоня назовам не ўзрушвае слых.
Лес Літва проста лес, дзе чырвоныя кроплі суніцаў...
А за светам такое — адразу займаецца дых.

Так і сталася потым — паездзіў па свеце нямала,
Лёс даваў падарожжаў напоўніцу выпіць нагбом.
Між Еўропай і Азіяй востра адчайна гайдала,
Мог забыцца зусім, дзе твой кут і радзінны твой дом.

У чужынскіх у землях напраўду багата дзівосаў:
Вось блакіт купалоў, мінарэтаў раслінная вязь.
Там гатычныя храмы ды стромкая гладзь хмарачосаў —
Вочы май і глядзі, без радзімы і вотчыны князь.

Аж яно не тваё — адпадае нарэшце зацьменне,
Прыгажосць — не сказаць, а душа застаецца нямой.
Так прыходзіць ураз ад спазнанай спакусы збавенне —
Людзі, край і зямля, дзе ты родны, жаданы і свой.

Я даўно ўжо вярнуўся, трывогі вярэдзяць Айчыны,
Забірае жыццё, не шукаю на шчасце падкоў.
Толькі што гэта раптам? — накоціць ізноў без прычыны
Колаў пошчак трывожны праз цемру і енк цягнікоў...

## Амерыканская мара

Сыйдзе цяжарная хмара,
Адбарабаніць даждҗом.
Амерыканская мара
Нас зачапіла крылом.

Вырай далёкі, нязнаны
Браму сваю адчыніў,
Аж на той бок акіяна
Сына з сабой падхапіў.

Тамака ў новым у свеце
Цэняцца розум і спрыт.
Цягнуцца нашыя дзеці
Здаць спакушальны іспыт.

Гэтак бывала спрадвеку –
Бралі навуку сыны.
Госпадзь даваў чалавеку
Роднай пазбыцца маны.

Толькі б сябе не забыцца,
Хто ты сам будзеш, адкуль.
Жывіць дзяцінства крыніца,
Помніцца мова пакуль.

Вернешся, толькі надыдзе
Выратавальніцкі час.
Скруха з зямлі нашай сыйдзе,
Прышласць пакліча ўсіх нас.

## Свая тэрыторыя

Трымаюць ад чорта ці д'ябла ў палоне,
Вярэдзяць спакусай завулкі душы
Чужая зямля, неспазнанае ўлонне,
Хоць кінь усё разам ды тут жа зграшы.

У час гэты востры ніхто не дарадца,
За спіну пляцак – ды ў нязведаны шлях.
Парою няўрочнай пацягне бадзяцца
Па новых краінах ды іх гарадах.

А што да цнатлівак, сяброў і напояў –
І ехаць не трэба, руку працягні.
Пахмеллем, згрызотамі ды неспакоем
Згарае наросхрыст імпэт у агні.

Так сілы сыходзяць – куды і навошта? –
Адзіна каханай цяпла не стае.
Пад небам плывуць недасланаю поштай
Лісты недапісанай кнігі твае.

На хутары дом недавершаны стыне,
І крыж-абярэг не пастаўлены тут.
Зямля забуцвела без рук селяніна,
Парушаны сэнсу спрадвечны статут.

Кружляць супыніся, нарэшце, мужчына,
На споведзь нясі свае шчыра грахі.
Гасподзь іх адпусціць, даруе Айчына –
Сваю тэрыторыю дбайна ўзрабі.

## Забраннік

Сваю памяць святлом наталі,
Згадка стане шчасліваю самаю:
Мае продкі жылі бы ў раі,
За высокай драўлянаю брамаю.

Рай той быў па-над Нёмнам-ракой,
Дабрадаць дзе разліта над краем,
На спрадвечны айчынны спакой
Стромы лес дзе з гары пазірае.

У суладдзі з прыродай жылі –
Радавод ад якога калена?
Моцна ўглыб запусціў карані
Праз стагоддзі наш хутар-засценак.

Зазірнуць бы ў той час з пекнатой –
Дзе аб райскім куточку казаннік?
Сплыў засценак з няспыннай вадой,
Засталася мянушка – Забрамнік.

Памятаў яе добра мой дзед.
Калі цвёрда падняўся на ногі –
Здзейсніў продкаў сваіх запавет,
Прывялі зноў на хутар дарогі.

Меў пашану заўсёды ў людзей
Волі, дадзенай Богам, абраннік.
Толькі літара дзелася дзе? –
Вымаўляць сталі проста: Забраннік.

І цяпер мы Забраннікі ўсе,
Спраўна дзедаўскі хутар трымаем.
Родаводны куток пакрысе
Зноў становіцца спраўджаным раем.

Плот з усіх ахінае бакоў,
Брама варту нясе, як належыць.
Тут на ростанях тлумных вякоў
Крыж засведчыць — жыве незалежнасць.

Дабрадаць датрымай у душы,
Спаконвечнай зямлі гадаваннік.
Па-над часам звініць у цішы
Рэха словаў — Забрамнік, Забраннік...

## Цішыня

Крыж вартуе мой хутар –
Не спяшайся ўцячы.
Адключы свой кампутар
І душу далучы.

Цішыня, глянь, якая –
Ні лісток не шуміць.
Ноч прыйшла трапяткая,
І душа не баліць.

Зоркі ў небе спагадна
Свецяць толькі табе.
Загадай неадкладна –
Час любові праб'е.

Побач лесу дыханне
Супакой дадае.
Дарагое адхланне
За трывогі твае.

Хата вокнамі свеціць –
Спаконвечнасць жытла.
Твой куточак на свеце,
Твой праменьчык святла.

Заўтра зноўку дарога –
Хай набудзецца сіл.
Трохі шчасця зямнога
Каля крыжа прасі.

* * *

Ціхім дажджом арабін
Восень наўсцяж сустракае.
Крочу праз чырвань адзін —
Сёння планіда такая.

Роўна палова ўсяго —
Голых галін і што з лісцем.
Шляху кахання майго
Дзе ратавальнае выйсце?

Ведаю: ты без мяне
Крыж свой нясеш адзіноты.
Хай лістабой абміне
Нашы бяззбройныя цноты.

Сэрца баліць, што не змог
Золкіх расстанняў пазбыцца.
На скрыжаванні дарог
Стрэча павінна адбыцца.

Вуснаў з гаркавінкай смак,
Любай адданыя вочы.
З ростані сыйдзем няўзнак,
Разам праз чырвань пакрочым.

Вецер сарваным лістком
Месца ля рэчкі пакажа.
Там пабудуем свой дом —
Лёс наш надзейна развяжам.

## У чатыры вочы

Сядзім з табою ў чатыры вочы,
Сагрэты вышняй любві цяплом.
Ніхто не зможа цяпер сурочыць
Кахання свята, наш ціхі дом.

Нарэшце тут вось адны ў сусвеце –
Нясцерпна доўга вялі шляхі,
Дзе рай так блізка, дзе мы як дзеці,
Якіх не ціснуць жыцця грахі.

За шклом чаромха ва ўбранні белым –
Вясновы водар хвалюе кроў.
Маўчым сягоння аб адбалелым,
Вярэдзіць раны не трэба зноў.

Агонь знішчальны закуты ў печы,
Нічога болей не спаліць ён.
Адны з табою, такія рэчы,
Салодка-мройных жаданняў сон.

# Ванны пакой

Пачынаецца быццам бы смехам,
Мілавання гульню пазнаю.
Ты пад душам – няспехам і спехам,
Бо на варце ў чаканні стаю.

Наталіцца табой немагчыма,
Пекната заварожвае зрок.
Я цябе забіраю вачыма,
Паміж намі адзін толькі крок.

Пара ўзбілася ў ванным пакоі,
Запацела спагадна акно.
Тут сыходзімся ў жарсцкім двубоі,
У абдымках зліемся ў адно.

Дзе мы зараз – не можам уцяміць,
Толькі кроў адбіваецца ў скронь.
Не сціхае пяшчотная замець,
Раздзімае спатольны агонь.

Засталіся адны ў цэлым свеце,
Хай віхурыць знадворку зіма.
Што тут зробіш – дарослыя дзеці,
Для якіх нат узросту няма.

* * *

Пакінь адзенне, хто сюды ўваходзіць,
У гмах кахання стромкі на дваіх.
Жаданняў пругкіх рупіцца нязводдзе,
Сустрэч салодкіх незваротны міг.

Абдымкаў звяз ад свету адняволіць,
Дрыготкай хваляй прабяжыць няўзнак.
Гульні хвіліны цягнуцца паволі –
Ты не прыспешвай насалоды смак.

Паўней пяшчотай пругкай наталіцца,
До донца любасць выпіць нам з табой.
Гуляе недзе блізка бліскавіца,
Чакае толькі пэўны момант свой.

Святлее змрок штораз ад нашых целаў,
Збавення стан агорне цеплынёй.
Спазнаны крык сарвецца грушай спелай,
Сваволіць рэха над усёй зямлёй.

## Канстанта сям'і

Дзіўнай музыкі коцяцца хвалі –
Завіруха мяце за акном.
Што адзін аднаму пажадалі,
Тое спраўдзіцца, прыйдзе дабром.

Нам не трэба багацця зямнога –
У любові адзіна пражыць.
Ласкі шчырае хопіць у Бога,
Каб звінелі ў душы капяжы.

Каб гучаў хваласпеў дабрадаці,
Пазначаў у цямрэчы святло.
Цеплыня каб трымалася ў хаце,
Каб праменіла ўтульнасць жытло.

Дзеці спяць – супакой і адхланне
За бясконцасць дарог і трывог.
Зберaглі ў нашых сэрцах каханне,
Што не кожны, напэўна, і змог.

Хай вірує ўсю ноч завіруха,
Не замесці ёй след аніяк.
Ловіць чуйна адкрытае вуха
Патаемнасці боскае знак.

# Спагада дарогі

Калыханкі паслухай дарожнае
Для адхлання самотнай душы.
Забірае ў палон, прываРожвае
Шоргат шын па вільготнай шашы.

Самаходы пажадліва коламі
Выпіваюць прасторы нагбом,
Падвываючы ціха, маторамі
Аддаюць кіламетры на злом.

Пралятаюць дамоў, несупынныя,
Толькі ты непрытульны стаіш.
Ці даруюць усе, каму вінен я? –
Адпытаецца вецер-скавыш.

Тармазні, брат, падкінь да нязнанага,
Да кахання шляхі пакажы.
Дай спакою дабрацца жаданага,
Каб патухлі згрызот міражы.

## Раз'яднанасць

Маладосць мы з табой разгубілі
На крутых паваротах жыцця.
Неашчадна вясновыя сілы
Мы растрэслі на радасць чарцям.

І каханне разбілі ў аскепкі –
Нашу еднасць як склеіць наноў?
Не ратуюць спатканні-налепкі,
Што здараюцца водгуллем сноў.

Мкнецца ўшыркі расколіна тая,
Што ўсё больш раз'ядноўвае нас.
Я душою пад небам лятаю,
Потым грукнуся вобзем не раз.

Ты ж належыш будзённым турботам:
Дзеці, дом і работа твая.
Адбіраюць гады незваротна
Нашу крэўнасць: ты тут, а там я.

І таму разуменне губляем,
Раз'яднанасць балюча пячэ.
Паміж радасцю й горкім адчаем
Неспадзеўкі жыццё працячэ.

Пачакай, прыпыніся, успомні,
Як мы марылі разам з табой.
Светлых згадак пяшчотныя промні
Хай адпрэчаць вястун-лістабой.

## Дзяўчыне

Голас пяшчоты й кахання
Кліча цябе хай заўжды.
Верыш — і прыйдзе адхланне
Жар астудзіць малады.

## Пакровы

Восень ціха пагляд прываражвае
Залатою шчымлівай парой.
Лісцяў-кветак мігценне прыгожае
Ашчаджае вястун-ліставой.

Ён сваё яшчэ возьме напоўніцу –
Скіне з дрэваў убранне на дол.
А пакуль сэрца радасцю поўніцца –
Фарбаў-водбліскаў цэлы прыпол.

# Тумановае кола

Густы туман каўтае першы снег,
З'ядае прагна, люта, ненажэрна,
Праявіць бруд, прысыпаны наспех —
Тым цысціню заб'е неміласэрна.

Будзённы тлум знішчае твой імпэт,
Да шчасця глуха зачыняе дзверы.
І не згадаеш, быў ці ты паэт,
Які кахаў, надзеяй жыў і верыў.

Суворы час, калі ніхто з табой
Да прышласці любові не пакрочыць.
Спрэс блуд душы, разлад і непакой —
Туманам дні падроўнены да ночы.

Але душа ўсё прагне любаты,
Ружовых мараў, пекнасці і шчасця.
Калі ж, калі бязладдзем нематы
На дабрадаць адведаем прычасця?

Быў першы снег — і вось яго няма,
Меў чысціню, а сёння енчыш: дзе я?
Туманных дзён адольвае гурма —
Што твой адказ і што твая надзея?

# Новы год

Запалілі гірлянды на дрэвах –
Еўрапейскі ідзе Новы год.
Напамін аб жыцця песняспевах,
Што на святы вядуць карагод.

Ды нярадасна сёння на сэрцы,
Бо за бляскам схаваўся падман.
Тут душою ніяк не сагрэцца –
Перманентна знядужаны стан.

Не пазбегнуць пякучага болю –
Час стваральны сыходзіць на тло.
Толькі знешняя форма, не болей,
Дрэў, праспектаў і гмахаў святло.

Горад свой а чужы, і краіна,
Беларусі ніяк не стае.
І бадзяюцца з горкай правінай
Непатрэбныя дзеці яе.

Усё ж пасунуся шляхам парадным,
Мо спагада сустрэнецца дзе?
Запалілі на дрэвах гірлянды,
Новы год як збавенне ідзе.

## Студзеньскі настрой

Пяшчотнае сонца і студзень
Залашчаць прадвесцем-цяплом.
Надзеяў накоціцца гудзень,
Зачэпіць вірліва крылом.

Нахлынуць шчымлівыя хвалі,
Разгоняць застылую кроў.
Усё, што сабе абяцалі,
Здзяйсняльным здаецца ізноў.

І хочацца жыць і смяяцца,
Радкі на сінечы пісаць.
Запал, твой хаўруснік-дарадца,
Пасцеліць праз вусцішнасць гаць.

Душы адступаецца верад,
Сплывуць пакаяннем грахі.
Не бойся, імкніся наперад,
Дзе горнія клічуць шляхі.

## Наканаванне ціхай язды

Спакой журботны ў стомленых вачах,
Адбітак жорсткіх даўкіхператрусаў.
Паэты ездзяць на старэнькіх "Жыгулях" –
Не перагнаць ім "новых" беларусаў.

Хаця зусім не супраць і яны
Утульна мчаць на новым "Мерседэсе".
Гаспадарамі сёння іншыя паны,
Няма ім спраў да ластавак у стрэсе.

Няхай і так, адкінем гэты спрыт,
З нас кожны плаціць па сваіх рахунках.
Плыве спакойна побач родны краявід –
Яго мінуў бы ў хуткасных варунках.

Спыніся проста ў ціхім гушчары,
Куды патрапіць больш ніхто не можа.
Грыбной заложнік ты і ягаднай пары –
Спакусе той "Пежо" не дапаможа.

Ці каля Нёмна выведай куток,
Глухі наўсцяж, дзе хамаў не бывае.
Гаючай сіні каўтані жывы глыток,
Дарэшты зліся з мілым родным краем.

І бездараж яго табе не ў знак,
Да хутара праедзеш без прыгодаў.
Душы спачынак, і няхай прабудзе так –
Наўзбоч трывог, і гора, і нягодаў.

## Пакліканне

У няпэўны час наш і трывожны
Пуцявіну вытапчы сваю.
На шчымлівым творчым раздарожжы,
Сапсаваны класікай, стаю.

І куды ісці цяпер, не знаю –
На адметнасць выспеліўся тэст...
Восень мілагучна,без адчаю
Падаруе паэтычны фэст.

Насамрэч шляхі цябе не клічуць –
Тут яны сышліся, дзе парог.
Хутар падаб'е і ўраз палічыць
Падрахунак пройдзеных дарог.

І каштарыс будучага шляху
Найдакладна ён табе складзе.
У паднеб'і вольным лёгкім птахам
Ты не будзеш плыць у чарадзе.

Іншыя хай крочаць у палоне:
Постмадэрн ці неакласіцызм.
Ціхі сум прадвосеньскі агорне,
Недарэчным здасца нарсіцызм.

Аніяк не спакушайся тэкстам,
Проста слухайся душы свае.
Не турбуйся формай ані зместам,
А пішы, як Бог табе дае.

## Лірыка кахання

*(у кайстру адсутнай літаратурнай палемікі)*

Каханне любіць скрэмзанасць паперы,
Адно каб сталася лягчэй.
Хаця,
Дзе словаў шмат і вобразаў звыш меры,
Там шчырасці бракуе й пачуцця.

Бо невымоўна гэта, безназоўна,
Хоць не складаны ўвогуле сюжэт:
Яна і ён — душа чаканнем поўна,
Калі жыцця адкрыецца сакрэт.

Няхай гучыць літанне як прымова,
Адзін радок — і запульсуе кроў.
Бруіць зямнога й незямнога змова,
Дэталь адна ўсё раскалыша зноў.

А ты свае выпісваеш згрызоты,
Хутчэй на продаж, чымся для душы.
Каханне ціха адыйшло на потым —
Каго ты зможаш так разварушыць?

Няхай на продаж, толькі каб ад сэрца,
А не эстэцтва дзеля, проста так.
Любоўны сверб ніяк не адгукнецца,
Адно паветра скалане няўзнак.

Лірычны кліч — надзейная падмога,
Яе паэт хапаецца найперш.
Калі кахаеш — выведзе дарога,
Пяшчота словам увальецца ў верш.

## Калегам-таварышам

Дзе іншыя вершы – там іншы свет,
Чаму на другіх непадобны?
Пакліканы я і абраны паэт,
І быць не магу падробны.

Спяваеце песню сваю, я – сваю,
Нікому ніхто не вінен.
Адно, на чым цвёрда да скону стаю –
Хутчэй нелюбоў адрынем.

Лябллю я вас розных, люблю такіх,
І толькі прашу – не зайдросьце.
Чароўным гучаннем радкоў маладых
Сябрамі заходзьце ў госці.

Я рады за вас, дык пакіньце і мне
Мой голас пяшчотны, ціхі.
Нядоля сябрыну няўзнак абміне,
Пазбудземся гэтак мы ліха.

## Развітанне з пахмеллем

Галава мая сёння як збан,
Як пастукаць – наўсцяж зазвініць.
Ты не ўводзь сябе, братка, у зман,
А прызнайся, што рупіць наліць.

Ды кульнуць яшчэ раз па адной,
Закусіць а чым Бог ды паслаў.
Затлуміць хісткі час гаманой,
Быццам велькім разумнікам стаў.

За ілжываю значнасцю слоў
І ляноту схаваць, і тугу.
Так пазбыцца жыцця ланцугоў,
Стацца пэўным, што выжыць змагу.

І яшчэ пяцьдзесят наўздагон,
А выходзіць на справе ўсе сто.
Незваротна ляцім пад адхон,
Разбураем свой лёс ні за што.

Хай турботнасць жыцця затане,
З ёю моцы змагацца няма.
У далёкай чужой старане
За жыццё, пэўна, болей цана.

Потым каву пацягне папіць,
Зноў па сто – і няўцямнасць плыве.
Галава не звініць, а шуміць,
Аж да лямпачкі ўсё галаве.

Як не пні, ад сябе не ўцячэш,
Паратункам не гэтакі стан.
А з пахмелля не пішацца верш,
Галава ж бо пустая, як збан.

## Да суладдзя

Адбівае паэзію тлум,
Мітусня ды старанне выжыць.
Непатрэбна-нязбыўны сум
Падкрадзецца лісою рыжай.

Каб украсці твой сыр-гаюн,
Каб надзею згубіў і веру,
І забыўся, што быў пяюн,
Словам светлым крапіў паперу.

Як ліса, так і сум — падман,
Не зняволься яму паддацца.
Разгайдана-няпэўны стан
Ненадзейны цяпер дарадца.

Акажыся мудрэй, вышэй,
Як мага, паімкні да волі.
Перамогамі будзь дужэй,
У суладдзі шукай спатолі.

Лісцем сонца залоціць след,
Восень цёплыя фарбы кіне.
Твой адзіна-чароўны свет
Прамінецца, але не згіне.

Беражы ты яго, сябе
Цудадзейна-няўлоўным словам.
Адначасна ў жніве-сяўбе
Адкрываешся вечна новым.

## Вершы Юрыя Кузняцова

Кніга — гэта жыццё, прачытаеш — і долю спазнаеш
Песнятворцы, які свае вершы ў натхненні складаў.
Разам з думкай высокай у вырай яго адлятаеш,
Дзе адкрыццяў багата, але і растурзаных спраў.

Разважанні твае — адгалоссе ягонага болю,
Звышшчымлівай тугі адкрыццё перальецца за край.
Па яго запавету душу адпускаю на волю —
У паднеб'і свабоды шырока і вольна гуляй.

Спазнаю Кузняцова, расійскага светач-паэта,
Помню нашу гамонку ў метро аглушальным начным.
Ён пакінуў наш свет, ды сягоння не варта аб гэтым,
Як душа азірнулася, тут засталася — аб тым.

Ён цяпер размаўляе шчымліва-самотна са мною
Словам шчырым сваім у палон забірае душу.
Яго споведзь паслухаю ціхай часінай начною —
Потым горка-сваё наўздагон пракрычу, напішу.

## Трыпціх Уладзіміру Савічу

1

Няўлоўны сон, душа трымціць,
Чакае ніва аратая.
Вястун-анёл з нябёс зляціць,
Крылом сваім перажагнае.

Няўлоўны згук не праміне
Наканаванай лёсам долі.
Анёл зляціць, крылом кране –
І фарбы выспеляцца ў колер.

Няўлоўны кліч – ізноў збірай
У кайстру вобразы Радзімы.
Абраных гоіць родны край,
Дзе да любові шлях адзіны.

Няўлоўны рух, душа гарыць,
Пераплаўляецца ў мастацтва.
Вярэдзяць згадкі аб гары,
Пайсці наперад – і застацца.

2

Воўк-адзінотнік, хутаранец,
Тут мы адной крыві з табой.
Як не наводзь знадворны глянец,
Душу вярэдзіць непакой.

Няма дзе рупнай прыпыніцца,
Калі разладжанасць наўкол.
Ссыхае на кары жывіца,
Над горнім уладарыць дол.

Але ратуе хутар родны
Наўзбоч растурзаных шляхоў.
Зямлі і волі знак нязводны,
Як выкупленне ад грахоў.

Як пераемнасці літанне,
Шляхетных мрояў светлы рой.
Аб новай долі звеставанне
Няўцямнай прывіднай парой.

Трымаюць моц падмуркі, сцены,
Куды збіраў ты камяні.
Перадаюць свабоду гены,
Калі жывыя карані.

## 3

Пэндзлік выслізнуў з пальцаў, упаў на падлогу,
Гук адбіўся па свеце да самай мяжы,
Абярнуўся прадвесцем, што зноў у дарогу,
Каб адкінуць міжчассем згрызотаў глыжы.

Зноў збіраць камяні на палетках Айчыны,
Каб шляхетна муры паўставалі наноў.
Шлях адкрыецца свой вынікова-прычынны
Сярод мноства падманных расстайных шляхоў.

Зноўку фарбы шукаць на прасторах Радзімы,
Каб ствараць для сябрыны вясёлкавы рай.
На вясновы настрой павярнуць перадзімны –
І ў прастору мастацтва да волі шугай.

Каб пакінуць нашчадкам не стогны і плачы,
А наўсцяж дабрыню, цеплыню, прыгажосць.
Шляхам майстра ідзі – і натхненне аддзячыць,
Ты на роднай зямлі гаспадар, а не госць.

## Шлях майстра

Надыходзіць пара,
Надараецца час,
Калі робіцца ўсё пустазвонным.
Майстру трэба спакой,
Ён стаміўся ад вас,
Вашай прагі аб хлебе надзённым.

Ператрусаў ліхіх
Не сціхае прыбой –
Ён стаміўся ад жорсткасці свету.
Для разбітай душы
Майстру трэба спакой,
Каб не збочыць свайго запавету.

Да аблуды наўпрост
Пуцявіна вяла –
Чалавецтва датупала краю.
Майстру трэба спакой
Зла наўзбоч і дабра –
Ён не хоча ні пекла, ні раю.

Майстру трэба спакой,
Каб сваё адпісаць,
Наастачу адкінуць змаганне.
А Гасподзь пашкадуе,
Прышле дабрадаць –
За знявагі і крыўды адхланне.

Майстру мроіцца дом
Па-над ціхай ракой,
Дзе да неба дарога адкрыта.
Больш нікога наўкол.
Майстру трэба спакой,
Ды каханне яго, Маргарыта.

## Мой Мінск

Наўзбоч гаманы шпацырую праспектам Скарыны — *
Маім адгукаюцца крокам стагоддзі, гады.
Сваёй прыгажосцю прывеціць удзячнага сына
Мой Мінск старадаўні, мой горад такі малады.

Даверліва лёс свой раскажа ў сумоўі сам-насам —
Хапіла за край ліхалеццяў, віхураў, завей.
У горадзе Верхнім падхопіць з сабою над часам
Званоў дабравест, толькі слухаць спрадвечнасць умей.

Адхланне і тут, і ў надрэчных прысадах цяністых,
Дзе Свіслач істужкай віецца, цячэ праз вякі.
Будзённасць паверне ад мрояў салодкіх, празрыстых —
Чароўнасць сустрэчы ў душы назаўсёды пакінь.

* Сёння праспект Незалежнасці.

## Версіфікацыя хоку

* * *

Прытрымліваю капялюш,
Калі іду над Свіслаччу –
Ветраная восень.

* * *

Бруд зямлі,
Прыцярушаны снегам –
Кліч пакаяння.

* * *

Птушыны спеў
З высокай дзедавай грушы –
Свята вясны.

* * *

Няшчырасць размоў,
Мільгаценне звыклых твараў –
Прага адзіноты.

* * *

Жаданне сну,
Спатольнасць няласкавых дзён –
Летуценні аб выраю.

* * *

Крыжы на ростанях,
Святло любові з неба –
Вера большая ад сымбаля.

* * *

Кліны ў целе зямлі,
Надзейна забітыя –
Крыжы для распяцця.

# ЧЫРВОНЫ РАДОК

## Санеты

## Натхненне

Нарэшце, дождж, — я так яго чакаў,
Жадаў звычайных восеньскіх праяў,
Калі расквецяць шыбы ручаіны,
Дарэшты змыюць за сухмень правіны.

Вада спатоліць смагу добрых спраў —
За колам дзён ты волі не дабраў.
Няпроста збочыць да сваёй сцяжыны,
Калі будзённасць выб'е каляіны.

Чакай і вер — надыдзе дабрадаць,
Каб свой радок дарупіў напісаць,
Які адзіна толькі ты і можаш.

Ліецца з неба светлы творчы плён,
Праз словы вобраз робіцца відзён —
Шчыруй з натхненнем, гэтым пераможаш.

## Спатольны шлях

Як раб, што неад'емны ад галеры,
Калі ў суладдзі з рытмамі грабеш,
Прыкуты ты да аркуша паперы,
Дзе вось павінен нарадзіцца верш.

Яго выношваў, і любіў, і верыў,
Што ён табе адкрыецца найперш.
Адчыніцца, як грукаеш у дзверы,
Калі сябе натхненню аддаеш.

Адно ўхапіць той момант адмысловы,
Знайсці жывыя трапяткія словы,
І не схлусіць душою анідзе.

Жадана ўльешся ў творчыя абшары,
Разгоніш думкамі наўкола хмары –
Да мэты шлях спатольны прывядзе.

## Чырвоны радок

Радок чырвоны новага жыцця
Даверыш рупна аркушу паперы.
Усёй душою прагнеш адкрыцця
Любові вечнай, шчырасці і веры.

Але наўсцяж самота небыцця,
У новы свет зачыненыя дзверы.
Знік першародны водар пачуцця,
Час ненадзейны, прыцемкавы, шэры.

Праз кола дзён на згубу не зважай,
Ары і сей, твая такая доля,
І дачакаеш – вырасце ўраджай.

Дзе светлы край, на ростанях дарог,
Наўзбоч згрызот, сумненняў і трывог
Цябе жадана перастрэне воля.

## Чын шляху

Калі жыццё натхненню не спрыяе,
Штодзень турботаў марных цераз край –
Зняверышся: душа не акрыяе,
Хоць ты яе нячысціку прадай.

За недасяжным воку небакраем
Жаданай выспай непазбыўны рай.
Ты не сябруй з самотай і адчаем,
А паратунку ў радасці шукай.

Знайдзі шляхі, з сабою каб у згодзе
Жыць дзень пры дні ў паганскім карагодзе,
Адкінь сумнеў у зверхнасці любві.

Спатолі знакам аркушык паперы,
Сцяной ад свету адгародзяць дзверы –
На светлы плён, Гасподзь, дабраславі.

## Згадкі страчанага раю

Вярэдзяць згадкі страчанага раю:
Сцяжынка, хутар, некрануты гай,
Дзівосаў светлых повен родны край —
Спазнанняў першых смак успамінаю.

Але дарма маленства я гукаю,
Якім ключом яго не адмыкай —
Закрыта брама на дарозе ў рай,
Іржа наўкол самоты і адчаю.

Сувора так накоціцца жыццё,
Пакуль не сыдзе зверху адкрыццё —
Усё з табой і ўсё ў табе праз годы.

Тады шляхі ў адну сплятуцца ніць,
Бо Ім наўсцяж пастаўлена любіць,
Свой райскі кут акрэслю назаўсёды.

# Жыццё

Калі цябе чакае хутар родны
З цярплівасцю сялянскай залатой –
Хай забярэ хутчэй інстынкт прыродны,
Туды, дзе ўсё буяе пекнатой.

Дзе край маленства, праз гады нязводны,
Чароўна-восеньскі, адзіна той.
Лес, луг і Нёман – водар першародны,
Жывой пяшчоты ласкавы настой.

Здаецца, больш нічога і не трэба,
І не турбуе спрэс кавалак хлеба –
Тут існаваць штотыдзень і штодзень.

Але ізноў кладзецца хмурны цень,
Ізноў за руль, і ў горад мкнешся порстка –
Быццё ў абдымкі забірае жорстка.

# Святло любові

Як з Гарадзеі едзеш у Нясвіж,
Трымаеш шлях у гэтым накірунку,
Наўзбоч дарогі там стаіць не крыж –
Сасна і дуб спляліся ў пацалунку*.

Машынаў хвалі разрываюць ціш,
Такога вось улада тут варунку.
Але ўсё роўна спынішся, стаіш
З надзеяй на прышэсце паратунку.

Няхай не крыж – таксама знак любві,
Яго адчуць, Гасподзь, дабраславі,
Каб не сплыло вадою часу міма.

Варушаць кроны ціхія вятры,
Цяплее часам гэтым унутры –
Святлом любві трымае нас радзіма.

---

* Прыродны помнік ужо не існуе

## Шляхцянка-восень

Шляхцянка-восень, я з табой блукаю
Па мяккіх сцежках страчанага раю.
Шляхі заслала згубленай лістотай,
Пякуча вабіш неспазнанай цнотай.

Брыду з табой, агорнуты пяшчотай,
Пачуюся абранаю істотай.
Мне аднаму сягоння фарбы краю –
Малюнкаў восеньскіх альбом гартаю.

Шпацыр вядзе нас ціха спаміж дрэў –
Дастаць спакою я даўно хацеў,
Калі з сабою кліча неба просінь.

Агонь жаданняў-дум не дагарэў,
Вярэдзіць тайнай горні песняспеў –
Не пакідай мяне, шляхцянка-восень.

## Пакінуць і застацца

Сябры мае, я вас люблю заўсёды –
Няхай сплыве бязладдзя чарада.
Сустрэчы нашыя з нагоды, без нагоды,
Пякучых дзён адчайная хада.

Не трэба нам шукаць няўлоўнай згоды,
Яднае вогненная нас вада.
Паўсюль яшчэ трываюць загароды,
І каля ганку зноў стаіць бяда.

Яе сябрынай-талакой адрынем,
Самоту дзён мы не-сябрам пакінем,
А самі будзем піць напой любві.

Калі адпрэчым выві́хі няволі,
Здабудзем творчае наўсцяж спатолі –
На любасць нас, Гасподзь, дабраславі.

# Дарогі

Пад грукат колаў хуткіх цягнікоў,
Ці пад імклівы мяккі шоргат шын
Аддайся ўвесь шляхам-дарогам зноў,
Расстанем з краем любым ты зграшы.

Бо засядзеўся хлопец пагатоў –
Няма адхлання стомленай душы.
Вандроўны вецер замалодзіць кроў,
Аб новым свеце любай напішы.

Правіны потым выправіш свае,
Падзякуй Богу, што наўсцяж дае
З палётам вольным хораша пабрацца.

А дома зноў цябе чакае праца:
Ад смецця дбайна чысціць катухі,
Перад Айчынай замаліць грахі.

## Шляхетны вобраз

*Уладзіміру Караткевічу*

Праз тлум стагоддзяў адчуваю роднасць
З вольналюбівым племенем сваім.
Шляхетны вобраз — вочы ў вочы годнасць,
Астатняе развееццa як дым.

Спрабуюць люта кожны раз нязводнасць
Да скону звесці — чуйся нежывым.
Але мы зноў адшукваем зыходнасць,
Нагамі цвёрда на зямлі стаім.

Бо калі хочаш звацца чалавекам,
А не рабом, атрэб’ем, недарэкам —
Трымай высока свой шляхетны гарт.

Даўмееш сэнсу словаў ”маю гонар“,
Жыцця й любові запалае горан —
Такія справы, мой шаноўны брат.

# АНТЫТЭЗА МАЛЕВІЧУ

Вясёлкавыя санеты

## Чорны квадрат

Дагоніць зноў мяне эпохі знак –
Напружана, з упартасцю вар'ята
Гляджу ў прадонне чорнага квадрата,
Які нам даў у спадчыну мастак.

Падман, міраж, на справе ўсё не так,
Квадрат бялюткі лепш бы мець за брата.
Але і тут цябе чакае страта –
Без аблямоўкі чорнай аніяк.

Вось так і стой паміж дабром і злом,
Але Гасподзь у роспачы не кіне –
Зямлю вясёлка ахіне крылом.

Жыцця шматфарбнасць да канца не згіне,
Дарога ў неба адратуе свет –
І я пішу вясёлкавы санет.

## Чырвоны

Палоска чырвані на белым полі
Ёсць кроў Хрыста, пралітая за нас.
Адкінь адчай у прасвятлення час,
Згадай наказ Яго любові й волі.

Адно балесным не дастаць спатолі –
Без рэха цемра сунецца ў адказ.
Дарэшты пляжыць дух чырвоны прас,
Бярэ ў палон пякучае юдолі.

Перачакай чырвоны, не бяжы,
Табе яшчэ зазвоняць капяжы,
Цнатлівасць жонкі прасціна адкрые.

Як падрахунак любасці, зліцця
Гасподзь дасць свету новае дзіця,
І чырвань – знак, што мы яшчэ жывыя.

## Аранжавы

Калі дажджы наўсцяж прыносяць морак,
Туманы тнуць да шэрай нематы,
Калі дратуюць Беларусь вятры —
Як хочацца на сонца і на мора!

Забудзь на непагадзь — такога гора!
Імкні на поўдзень сонейку ў сваты,
Дзе апельсін красуе залаты,
І над людзьмі не валадарыць змора.

Бракуе пекнай фарбы ў нашым краі,
Але прасі, і літасцівы Бог
Цябе не кіне ў сцішаным адчаі.

Вясёлку дасць, каб ты разгледзець мог
Нязвыклы колер, радаснае ззянне —
Яно вястуе сонца і каханне.

# Жоўты

Жар-птушку меў злавіць, ды не ўдалося,
Адно ў руках пярынка ад хваста.
Самоту скінь, што казку не дастаў —
Цябе калыша фарбай спелай восень.

Іскрынка не згасае — так вялося
З пачатку свету, калі змрок растаў.
Як водсвет з неба на зямлі паўстаў —
Жыццё сцвярджае золата калосся.

Глядзі і думай: што за цуда ніва!
Заўваж яшчэ гарлачык на вадзе —
Салодка мроіцца на свеце жыць шчасліва.

Каханне пругка сцежкамі вядзе,
І ўсё ж журбінку колер наш дастане —
Вярэдзяць згадкі блізкага расстання.

# Зялёны

Ёсць абнаўленне вечнага мастацтва:
Душа крыляе, поўная надзей,
Струменіць малады імпэт з грудзей,
Бруіцца зеляно-віно юнацтва.

Але і сталасць — не адчай жабрацтва,
Да лазні венік свежы давядзе —
Мужчынскай моцы знойдзеш як нідзе,
І, чысты, кроч з прыродай у сваяцтва.

Лугоў прывабнасць з муравой-травою,
Лясоў пяшчотнасць — гэта ўсё са мною,
Ёсць слодыч еднасці здавён-даўно.

Зялёны колер — колер супакою,
Іду, бы ў замаруджаным кіно:
Рай пры дзвярах ужо — падаць рукою.

## Блакітны

Блакіт бяздоння – кропка прыцяжэння,
Далёкі, вабны, недасяжны свет.
Кінь фарбу ў кайстру, калі ты паэт,
Блакіт быць мае мерай узвышэння.

Але пры тым не пакідай сумнення,
На трэцім небе – поўдарогі след.
Хоць тут няма ні гора, ані бед –
Яшчэ не выспеў час богаяўлення.

Зарукай нашай годнасці і волі
Блакітная пульсуе ў жылах кроў,
Наўсцяж вястуе веру і любоў.

Яшчэ вачэй блакіт, надзеі стан –
Усе шукаем новай шчаснай долі,
Дзе сам сабе ты гаспадар і пан.

## Сіні

Шукай-знайдзі свой васілёк у жыце,
Здабудзь радок, каб любасць напісаць.
Сцялі нямоглым праз вусцішнасць гаць,
Дай напамінак — з песняю жывіце.

Спрабуюць звесці конча дабрадаць,
Перахрысціць у нелюбві карыце.
Падпіхваюць — угору не глядзіце,
А за відовішча і хлеб — душу прадаць.

Жывём мы, людзі, не адзіным хлебам,
А і высокім горнім сінім небам,
У роднай мове словам ад Яго.

Калодзеж сіні дасць святой вадзіцы,
Журба святлом радзімы загаіцца,
І нематы мінецца карагод.

# Фіялетавы

Ляцелі гусі, скінулі пярынку,
А чалавек яе ў далонь злавіў.
І з неба кроплю ўдала падхапіў —
Вясёлка знізу аддала часцінку.

Не прамантачыў Боскую іскрынку —
Атрамант з пёркам шлюбам заручыў
І слова запісаў сабе наўздзіў,
Пачаў шукаць яго як залацінку.

Свой час, свой лёс натхнёна майстар піша,
Душу высокім тэкстам раскалыша,
Дзе грунтам запаветнае: ”любіць“.

Ды толькі ёсць адна перадумова —
Каб не скруціцца, чалавекам быць,
Няхай не стане разбуральным слова.

## Вясёлка

Аж дзве вясёлкі сёння над зямлёю –
Ад шчасця ўраз на сёмым небе ты.
Вышэй няма праяваў пекнаты –
То дабрадаць Гасподняя з табою.

Але згадай часінаю святою,
Які да Неба шлях вядзе круты.
Прастол там Божы ззяе залаты –
І не спасцігнуць вечнасць галавою.

Сем дзён тварэння, сем нябёсаў, сем
Вясёлкі колераў ва ўсёй красе –
Містычны лік загадкаю паўстане.

Знак запавету вечнага даў Бог,
Каб чалавек зямлю сваю зберог,
І тым адпрэчыў небыццё, кананне.

## Шэры квадрат

Не пробліска надзеі анідзе,
Паблякласць фарбаў знуджаных абшараў,
І сонца не выглядвае з-за хмараў,
Вясёлка збегла пудка ад людзей.

Здаецца, крок адзін – і быць бядзе,
Аб тым вястуе невыразнасць твараў.
Святкуе шэрань бездараж кашмараў,
Калі наперад любасць не вядзе.

Змяшаласць зла й дабра наўкол цябе,
І выбрацца, падасца, немагчыма.
Твой грэх, разумнік, гэтаму прычына.

Але не здайся ў вечнай барацьбе –
Адкінь адчай і шчыра памаліся,
І да святла ад шэрані прарвіся.

## Белы квадрат

Як разгадаць загадку чысціні,
Бясконцасці без межаў і без краю?
Знайсці дарогу рупіцца да раю,
Дзе грэх і шчасце маюць карані.

Спакуса недасяжнай вышыні –
Адзення праведнікаў край кранаю.
Адзіны крок – і, верыцца, спазнаю
Вышэйшы сэнс праяваў дабрыні.

Лілеі белай лекі ад нягод,
Адзення бель, і белы параход,
Куды імкну ад крыўдаў чалавечых.

Бязмежнасць падступае спакваля,
Як Боскае святло канстантаў вечных:
Тут Неба новае і Новая зямля.

# ЦЕСНАЯ БРАМА

Евангельскія згадкі

# Маналог другога

Што шчыруеш, паганец?
Што слова злое кідаеш да Яго:
калі ты Хрыстос, выратуй сябе і нас?
Ці не баішся Бога, калі сам укрыжаваны з Ім разам?
Мы то асуджаны справядліва,
бо нішчылі нашы палі і лугі,
ссякалі нашы лясы, такія велічныя і ўтульныя,
гаманкія і спакойныя, багатыя і безабаронныя.
Мы выколвалі блакітныя вочы зямлі нашай — азёры,
забруджвалі іх
разам са спакойнымі рэкамі і рачулкамі нечыстотамі сваімі.
Мы прагна высмоктвалі паветра Айчыны,
на месцы чыстага водару ўзбіваўся смурод
наўтыканых частаколам труб-вежаў.
Мы рэзалі магутнымі жалезнымі араламі плоць зямлі нашай,
каб выпетрала жывароднасць яе
і не змагла яна хлеба нам даць надзённага...
Мы спаскудзілі ўсё.
Але самае страшнае —
мы забралі ў народа нашага яго песні, яго святы,
яго памяць,
закапаўшы гісторыю сваю чужымі рыдлёўкамі.
Мы забілі ці згнаілі лепшых людзей гурту беларускага,
каб нават голасу іх не было чуваць.
І нарэшце —
мы вырвалі з коранем душу народа — яго мову,
і толькі рэха адбівае
апошнія спробы адзінак маліцца ў ёй за Айчыну.
Кнігі спрабавалі спаліць усе,
каб і літары роднае ўбачыць было немагчыма...

Так і не ўдалося ўсяго,
ды злачынства наша невымернае.
Укрыжаванне —
дастойнае па справах нашых, па вышэйшай справядлівасці.
Ёсць яна,
бо сёння на Галгофе, месцы чарапоў,
не народ наш,
якому мы здрадзілі і што мага сілы цягнулі сюды,
а мы самі — паскуднікі, злодзеі, забойцы і ганьбаваннікі.
А Ён? —
Ён нічога благога не рабіў,
пакуты прыняў за ўсіх нас, грэшных.
Дык пакайся, паганец!
Бо хутка цемра накрые зямлю нашу ўсю.
Праўда, за тры гадзіны доўгачаканае святло
залье здратаваную Бацькаўшчыну,
святло надзеі.
Ды мы ўжо не ўбачым яго...
О Божа, прымі маё пакаянне!
Нарэшце адкрылася мне,
што не можа ніхто ў свеце перамагчы народ свой і зямлю яго.
Змілуйся, Літасцівы!
Памяні мяне, Госпадзі,
калі прыйдзеш у Царства Тваё!
Амінь.

# Маналог падарожнага

Ідзём-брыдзём знямоглыя, бяссільныя.
Не сябрынаю дружнаю,
а натоўпам раструшчаным,
бясформенным, бязвольным цягнемся,
штурхаемся і піхаемся.
Спрэс раздарожжы, скавышамі прадзіманыя.
Месца спакушэння, месца дыявала.
Ісці куды?
Дзе крыж на ростанях,
што дапамогу праменіць нам, падарожным?
Мільгане абрыс яго надвячоркам,
ды зноў цемра схавае знак дабрадаці Гасподняй,
бо дзеі нашы ліхія, неправедныя.
Не трымаем любові адзін да аднаго,
спагады не маем,
не мірымся, пакуль у дарозе,
з непрыяцелямі і праціўнікамі сваімі.
Айчыну занядбалі,
не ведаем гісторыі сваёй,
крыжовага пакручастага шляху,
асвечанага годнасцю папярэднікаў, іх любоўю і верай,
таму і шлях у будучыню знайсці не можам.
Першапуткі топчам восеньскаю слотаю
па зламаных бурамі пералесках,
утравелых няўдобіцах, багне спакусаў,
быццам няма ў свеце побач шляхоў светлых, простых,
па якіх можна ісці да людскай прышласці.
Цягнем з сабою дабро сваё,
пажытак плоці,
бязвер'е і малавер'е зацемнілі ісціну,
што скарб духоўны трэба збіраць уверсе,

дзе ў непарушнасці будзе,
негледзячы на насенне беспамяцтва,
што сеюць князі свету гэтага.
Бясхатнікі,
туляемся па чужых вяселлях
і грэемся каля чужых вогнішчаў.
На сваё вяселле пакліканыя былі,
ды не ўразумелі таго,
заліўшы вочы атрутным напоем,
адпрэчыўшы віно
першага цуду Ягонага для абраных,
утапіўшы душу ў падмане, блудзе, ігрышчах.
Ізноў сунемся ў цемры падступнай,
не слухаем голасу прарокаў Айчыны сваёй,
не шануем тых,
хто збіраў камяні для падмурка Бацькаўшчыны.
Топчам цьмянымі дольнімі шляхамі,
не зважаючы па няверʼю,
што ёсць шляхі горнія,
дзе на скрыжалях запісана наша гісторыя,
дзеі ўзнясення духу беларускага,
імёны слынных продкаў.
Імгненнае прымае за вечнае,
быццам мы першыя і апошнія на гэтай зямлі,
быццам намі яна і скончыцца.
Яшчэ грэх бяром на душу,
бо Бацькаўшчына,
як і родная мова,
дадзена нам Госпадам,
і дары гэтыя памнажаць трэба, а не закопваць у зямлю.
Возьмем кожны свой крыж
і пойдзем светлым следам Ягоным.
І няроўныя дарогі стануць гладкімі.

І прывядуць яны да роднай Беларусі,
дзе пабудуем свой Дом
і ўзвядзём Храм у гонар імя Яго.
І паставім крыж на ростанях дарог і стагоддзяў,
каб знак любові Ягонай
аберагаў нас ад сілаў цёмных.
Падрыхтуем шляхі Госпаду,
простымі зробім сцежкі Яму.
Амінь.

## Маналог брамніка

Стаю адзін
перад штоpазоваю спакусаю адзіноты.
Як вартавы, якога паставілі адвеку,
ды змяніць забыліся.
Да цеснай брамы прыстаўлены,
што вядзе ў жыццё,
да царства нябеснага,
да вытокаў сваіх, да Айчыны любай.
Нямногія знаходзяць шлях гэты,
гул ледзь чутны сведчыць –
звабы свету праносяць людзей
наўзбоч шырокаю дарогай,
напханаю аўто,
што імчацца несупынна
насустрач падманнаму бляску гарадоў,
дзе ўсё выштукавана дзеля задавальнення плоці:
рэстарацыі, бары,
гульні, забавы, ігрышчы, музыка,
што б'е рытмам у галаву
і выбівае з яе рэшткі думак, развагаў, сумненняў.
Навошта шукаць веры,
калі ёсць магчымасць насалоды цела?
Шырокія брамы панаўзведзены спрэс,
клічуць яркімі водсветамі
аддацца радасцям быцця.
На імклівай хуткасці
не згледзець вузкай сцяжыны,
што вядзе ад чыгуначных ды асфальтавых паясоў,
якімі спрэс падпярэзана цела Айчыны,
да мэты сапраўднае,
да жыцця вечнага, а не ў пагібель.

Сцяжыны,
якую вартуе крыж,
якая не утравела дарэшты толькі высілкамі абраных.
Няшмат іх,
але ідуць сцяжынаю вузкаю,
грукаюцца ў цесную браму —
і адчыняю ім.
Усім, хто грукаецца, адчынена будзе.
Адкрыюцца горнія шляхі
айчыны нашай, Маці-Беларусі,
адкрыецца святло дабрадаці Ягонай
над нашым краем,
адметным сваёй гісторыяй,
слыннымі продкамі і дзеямі іхнімі,
высокімі знакамі стагоддзяў.
Прайсці брамаю памяці,
ўбачыць знакі тыя, уведаць іх —
тады сплятуцца ў адну нітку
памкненні папярэднікаў і наступнікаў,
выявіцца карціна мінуўшчыны ды сучаснасці,
акрэсліцца наступнасць,
і Беларусь паўстане ўжо незваротна.
І калі Гасподзь прыйдзе з пытаннем,
куды падзелі мы дабрадаць дадзеную,
дзе закапалі таленты свае,
адказам будуць справы абраных
дзеля ўгрунтавання Бацькаўшчыны.
Будзем пільнымі брамнікамі,
бо не ведаем,
калі прыйдзе гаспадар дома:
увечары, ці апоўначы,
ці як запяюць певўні, ці раніцай?
Шмат хто будзе імкнуцца ўвайсці,
і не змогуць.

Не ведаю, адкуль вы, –
скажа Госпадзь,
які сам ёсць брамаю жыцця вечнага, –
бо веры не маеце,
бо самі не ведаеце, хто вы і адкуль,
бо забыліся на карані свае,
зракліся Айчыны сваёй і не месца вам за брамаю.
Шукайма шляхі горнія,
сцяжыну вузкую і цесную браму,
што вядуць у жыццё.
Грукаймася, ды адчынена будзе.
Амінь.

# Маналог пастуха

Кіньце пагляд угору.
Падыміце вочы ад зямлі,
якую штогод аром зацята з надзеяй і трывогай —
ці дасць ураджай?
Падыміце голаў
ад клопатаў аб хлебе штодзённым,
ад турботаў і спакусаў асалоды цела,
ад мітусні і бяссэнсіцы жывёльнага існавання.
І ўбачыце зорнае неба сваёй Айчыны,
на горніх скрыжалях якога
запісаны слаўныя імёны і дзеі яе.
Шукайце зорку на ўсходзе,
якая прывяла да народжанага Збавіцеля
і паказала шлях да Запавету Новага.
Бліснула — і знікла,
назаўсёды застаўшыся ў душах абраных.
Колькі іх,
што нясуць горняе святло,
што чакаюць збавення —
шчаслівай зоркі над сваім краем?
Колькі іх, ўратаваных вераю?
Колькі іх, што ведаюць свайго пастыра?
Бальшыня блукае ў цемры,
знясіленая і пакінутая.
Найміты і чужаніцы не глядзяць статку,
не збіраюць духоўныя скарбы беларускія,
не дбаюць аб повязі часоў, аб памяці гістарычнай,
без якой няма прышласці.
Прыхадзень у ліхую гадзіну
пакідае статак ваўкам на рабаванне і ганьбаванне,
знішчэнне гарту беларускага.

Ілжывыя пракокі
як ваўкі ў авечай скуры
адпрэчваюць гісторыю нашу,
каб забыліся мы, адкуль будзем родам,
ліюць салодкія зманныя словы,
каб адракліся імя свайго,
перасталі людзьмі звацца.
Але не бойцеся быць авечкамі сярод ваўкоў,
бо за намі праўда.
Каб не рассеяліся авечкі статку,
гуртавацца трэба дзеля шчаслівай прышласці,
каб жыла, мацнела і квітнела
радзіма наша — Беларусь.
Трэба трымацца Госпада — пастыра добрага,
які жыццё сваё аддаў за нас,
слухаць светлых слоў евангельскіх.
Усім — і пастухам, і гурту
трэба быць авечкамі Госпада,
а не статкам свіней, апанаваных дэманамі,
імя якім — легіён,
якія слухаюцца цела свайго
і таму паддаюцца спакусам дыявала,
якім даспадобы посах жалезны,
статкам рабоў без волі і годнасці.
Пастух авечкам Пастыр Добры,
што пасвіць не кіем, а любоўю,
ужо ўвайшоў дзвярыма,
і зорка на ўсходзе
сведчыць аб тым праз стагоддзі.
Не бойцеся аблудных дарог —
зорка выведзе на праведны шлях.
Гасподзь шкадуе нас, знямоглых і засмяглых.

Пастыр Добры прыме нас,
як згубленую авечку,
і ўзрадуецца,
што знайшліся для жыцця новага, шчаснага,
адухоўленага верай у бязмежнасць Яго,
верай у свае сілы
і адраджэнне Бацькаўшчыны.
Будзьце пэўнымі, заззяе зорка дабрадаці
і над нашай Беларуссю,
прадзіманай скразнякамі выпрабавальных скрыжаванняў.
Заззяе над пастаўленым на раздарожжы
крыжам-абярэгам і высветліць шляхі нашыя,
якімі пакрочым да светлай прышласці.
І калі збяруцца народы перад Ім,
месца нам будзе праваруч Госпада,
а не леваруч, як казлам,
якіх чакае геена вогненная.
Амінь.

# Маналог сейбіта

Сеем разумнае, добрае, вечнае.
Сеем любоў да Бацькаўшчыны сваёй,
Беларусі.
Толькі ўраджай небагаты.
Бо не ведаем, не бачым, не рупімся,
куды падае насенне нашае.
Дзяўбуць яго пры дарозе птушкі;
мясціны камяністыя, дзе няшмат зямлі,
не даюць плоду;
кінутае ў церні заглушаецца імі.
А калі і трапляе добрае насенне на зямлю плодную,
то ворагі, чужаніцы, сычы сваёй гадоўлі
тут жа і куколь сеюць,
і цяжка потым збіраць ураджай –
усё ў купе адной перамешана.
Сейбіт слова сее.
Але многія не разумеюць яго,
прыходзіць ліхі і крадзе пасеянае ў сэрцы іх.
Шмат хто з радасцю прымае слова,
але не мае каранёў у сабе,
праз уціскі, ганенні за вестку аб Айчыне
спакушаецца і не чуе болей.
Іншыя чуюць,
але клопат веку і пажада багацця
заглушаюць слова,
і яно застаецца бясплодным.
І толькі праз абраных,
якія чуюць горнія літанні і разумеюць іх,
слова плод прыносіць.
Ды няшмат іх,
шчырых руплівіцаў на роднай ніве,

якія нястомна шукаюць зямлі новай,
сапраўднага поля,
дзе схаваны скарб нятленны –
Царства Нябеснае.
Шукаць яго для сябе і дзеля Айчыны сваёй,
каб не скончылася на нас гісторыя наша,
каб не сталі самі
далакопамі Бацькаўшчыны.
Злыдняў і так даволі,
што толькі і рупяцца,
каб забыліся мы на свае карані, сябе зракліся.
Калі соль страціць сілу,
чым асоліш зямлю,
якое насенне дасць плод на ёй?
Пустэльня адна застанецца
на месцы нашых лясоў, лугоў, палёў, азёраў і рэк,
на нашай утульнай для чалавека зямлі.
Змагацца трэба, араць,
не азірацца на накінутае чужаніцамі мінулае,
але трымаць ў памяці
сапраўдную гісторыю сваю, залатыя яе перлы.
І сеяць насеннне жыцця вечнага,
як продкі нашы сеялі,
годна і вольна дбаючы аб Айчыне сваёй.
Толькі ніяк не можам сабраць ураджай іх,
ніяк не ўдаецца аддзяліць жыта ад куколі,
выбраць яе найперш і спаліць яе ў печы вогненнай.
А жыта засыпаць у скарбніцу сваёй радзімы.
Бо работнікаў жніва мала.
Бо дбаем больш,
што нам есці і піць,
ува што апрануцца,
турбуемся днём сённяшнім,
а не шукаем валадарства любові.

Бо не верым,
не просім у Госпада дабрадаці
краіне сваёй,
не шукаем найменшае зерне надзеі,
якое вырастае большае за ўсякую траву
і дрэвам робіцца,
да якога прылятаюць
і ў голлі якога ўюць гнёзды птушкі нябесныя.
Бо не цемім, што з двух на полі
адзін возьмецца, другі пакінецца,
не шчыруем быць тым,
каго Гасподзь возьме ў Царства сваё.
То не занядбайма высілкі папярэднікаў нашых,
што ўзраблялі ніву Айчыны,
тады і дастане Беларусь
малітвамі нашымі дабрадаці,
і ўскаласіцца ніва, запалавее жыта,
і дасць насенне плод шматкроць.
І пашле Гасподзь на жніво работнікаў сваіх.
І будуць араты, сейбіт і жнец як адно,
і будзе радасць вялікая,
і будзе прышласць светлая.
Амінь.

## Маналог абранага

Клічуць усіх.
Гукае Маці-Беларусь,
ды толькі голас гэты праходзіць праз душы нашы,
не адбіваючыся і не затрымліваючыся.
Як і Яго слова.
І толькі зрэдчас адаб'ецца,
як ранішні прамень сонца ў люстраной вадзе
рэк і азёраў нашых,
душа ўстрапянецца,
і ўвойдзеш незваротна ў шэрагі абраных...
А навошта чуць, шукаць, настройваць струны душы сваёй,
цярпець, пакутаваць?
Прасцей аддацца вязкаму цячэнню хуткаплыннасці,
імгненнасці, штохвіліннасці, плыць разам з усімі
ў пошуках асалоды цела, за залатым дукатам,
не цямячы, што метал цягне да дна.
Ганяцца за грашыма, прадаўшы душу д'яблу,
за ўцехамі, тапіць сумненні і рэшткі духа ў віне,
ачмураючы розум свой атрутай.
Лягчэй слухаць чужых шаманаў,
калдуноў, экстрасенсаў, ілжэпрарокаў і думаць,
што тое і ёсць шляхі выратавання, што даніна аддадзена.
Але каму аддадзена?
Прасцей адключыцца музыкай сатанінскай,
што сваім нечалавечым рытмам забірае душу,
нікога не любіць, акром сябе,
бо тое высілкаў немалых патрабуе.
Прасцей забыцца,
хто ты, што ты і адкуль родам,
тады не будзе згрызотаў за боль роднай зямлі,
за яе раны, што смыляць незагойна.

Прасцей не чуць гэтай адчайнай позвы,
гэтага голасу, што кліча да пакаяння штодзённага,
да ачышчэння, да любові, да працы.
Прасцей ілгаць, падманваць, двурушнічаць,
паўзці ў салодкай цемры,
забыўшыся дарогу да храма.
Прасцей прадаць Бацькаўшчыну
за трыццаць срэбнікаў,
чымся ахвяраваць усё служэнню ёй,
служэнню адданаму, руплівому, сейбітнаму.
Прасцей не сеяць, не жаць, не збіраць ураджай,
а толькі карыстацца плёнам рук іншых...
спыніся, паслухай.
Пачуй галасы слынных продкаў сваіх,
што годнасць мелі і гонар,
што сцераглі Айчыну і жыцці свае клалі на аўтар яе.
Адчуй, як іх кроў грукае ў сэрцы нашыя.
Зразумей адчай здратаванай зямлі роднай,
што ўжо не можа трываць дзікунства і гвалт наш.
Пачуй стогн Маці-Беларусі.
Пачуй слова Яго.
Спыніся,
і ўхопіш дзівосны спеў,
што адбіваецца пад зводамі храма і адлятае светла ўвышыню,
пакідаючы спакой і суладдзе на душы...
Прычасціся крыві і цела Яго,
прыпадзі да пяшчотных грудзей маці сваёй Беларусі –
і адчуеш моц жыць і любіць,
будаваць свой дом праўдзівы ды ісці шляхам простым.
Амінь.

# Маналог дойліда

Пясок,
спрэс пясок наўкола.
Быццам гэта не зялёная Беларусь
з мяккімі мурожнымі травамі ў рэчышчах вялікіх і малых,
шматлікіх як горнія шляхі рэк,
са свойскімі інтымнымі лясамі,
гаючымі гаямі ды лагоднымі дубровамі,
з блакітнымі вачыма азёраў,
куды перакулена прыгожае хмарна-барвянае неба,
з палямі небагатымі, але ўраджайнымі працай,
з камянямі дзівоснымі крыжовымі, —
а пустэльня голая...
Пустэльня, дзе каменя на камені не пакінулі.
Адзін пясок.
Дзе ж камень?
Пазбіралі іх, сцерлі на пыл, пазносілі ў крушні,
паразвозілі, расцягнулі па блізкіх і няблізкіх
чужых ваколіцах.
Бальшыню на пыл сцерлі —
Войны, немачы, бязбожнасць людская,
сваёй гадоўлі сычы,
недароды, падман, ліхалецці.
Як сцерлі гісторыю нашу,
лепшых людзей зямлі нашай,
ірвучы крэўную повязь.
Хто падаўся ў прочкі,
аддаўшы жар душы другім народам і землям,
хто тут выракся й бяспамятным зрабіўся,
каго ў расход пусцілі.
Дзе вы?
Колькі камянёў параскідалі —
як сабраць?

Дзе камень той, што павінен легчы ў кут падмурку?
Адшукаць як?
Будаваць жа толькі на ім,
камяні духоўнасці, веры,
а не на пяску наўкольнаму
нашай змучанай пакутамі і бязладдзем стагоддзяў душы.
Інакшай не тое што дом,
храм рассыплецца і зноў жа пяском стане,
сыпучым і безнадзейна адчайным,
нат падмурку не застанецца.
А быў жа ён, разабралі, калі храм рушыўся,
шляхі павысцілалі ў "светлую будучыню",
але не Таму,
каму чыстымі і светлымі трэба зрабіць іх.
Дарогі тыя зноў жа пяском занясло,
ізноў шукаем шлях свой беларускі крыжовы,
няўцям,
што высцілаць яго наноў трэба спачатку Адзінаму,
каб даравў нам грахі і правіны нашыя.
Даўно ўжо час
шукаць, збіраць камяні і класці падмурак,
каб сцены потым выраслі і дах узляцеў з купалам у неба.
Крывёю, потам і слязьмі шукаць няспынна адзіны,
той,
што ляжа ў кут гмаху...
рушымся, каму вочы не пазасцілала,
хто і ў прыцемках звар'яцелага часу
намацаць можа камяні зямлі нашай,
хто душу сваю не прадаў яшчэ сілам д'ябальскім,
хто не прадаў і не здрадзіў Бацькаўшчыне, Маці-Беларусі.
Хадземце.
Дарогаю да храма.
З верай, любоўю і надзеяй.
Амінь.

# ЗМЕСТ

ГОРНІЯ СКРЫЖАЛІ. Іерусалімская нізка
Мая Святая Зямля ............ 6
Калодзеж Марыі ............ 7
Віфлеемская зорка ............ 8
Іудзейская пустэльня ............ 9
Хрышчэнне ў Іярдане ............ 10
Гара Спакусы ............ 11
Камяні і хлеб ............ 12
Цуд у Кане Галілейскай ............ 13
Светлы след ............ 14
Гара Фавор ............ 15
Іерусалім ............ 16
Елеонская гара ............ 17
Гефсіманскі сад ............ 18
Вязніца ў Прэторыі ............ 19
Вуліца Смутку ............ 20
Храм Святой Дамавіны ............ 21
Галгофа ............ 22
Пліта памазання ............ 23
Дамавіна Хрыста ............ 24
Святы агонь ............ 25
Прыцягненне ............ 26

КРЫЖЫ НА РОСТАНЯХ. Вянок санетаў ............ 28

СВАЯ ТЭРЫТОРЫЯ. Лірыка
Шлях да гары ............ 44
Згадкі аб цудзе ............ 45
Тураўскія крыжы ............ 46
Беларускія мае стагоддзі ............ 47
Трываласць ............ 48

Кардыяграма ....................................................................... 49
Покліч дарог ....................................................................... 50
Амерыканская мара ....................................................................... 51
Свая тэрыторыя ....................................................................... 52
Забраннік ....................................................................... 53
Цішыня ....................................................................... 55
...Ціхім дажджом арабін... ....................................................................... 56
У чатыры вочы ....................................................................... 57
Ванны пакой ....................................................................... 58
...Пакінь адзенне, хто сюды ўваходзіць... ....................................................................... 59
Канстанта сям'і ....................................................................... 60
Спагада дарогі ....................................................................... 61
Раз'яднанасць ....................................................................... 62
Дзяўчыне ....................................................................... 63
Пакровы ....................................................................... 64
Тумановае кола ....................................................................... 65
Новы год ....................................................................... 66
Студзеньскі настрой ....................................................................... 67
Наканаванне ціхай язды ....................................................................... 68
Пакліканне ....................................................................... 69
Лірыка кахання ....................................................................... 70
Калегам-таварышам ....................................................................... 71
Развітанне з пахмеллем ....................................................................... 72
Да суладдзя ....................................................................... 73
Вершы Юрыя Кузняцова ....................................................................... 74
Трыпціх Уладзіміру Савічу ....................................................................... 75
Шлях майстра ....................................................................... 78
Мой Мінск ....................................................................... 79
Версыфікацыя хоку ....................................................................... 80

ЧЫРВОНЫ РАДОК. Санеты

Натхненне ....................................................................... 82
Спатольны шлях ....................................................................... 83
Чырвоны радок ....................................................................... 84

Чын шляху ....... 85
Згадкі страчанага раю ....... 86
Жыццё ....... 87
Святло любові ....... 88
Шляхцянка-восень ....... 89
Пакінуць і застацца ....... 90
Дарогі ....... 91
Шляхетны вобраз ....... 92

АНТЫТЭЗА МАЛЕВІЧУ. Вясёлкавыя санеты
Чорны квадрат ....... 94
Чырвоны ....... 95
Аранжавы ....... 96
Жоўты ....... 97
Зялёны ....... 98
Блакітны ....... 99
Сіні ....... 100
Фіялетавы ....... 101
Вясёлка ....... 102
Шэры квадрат ....... 103
Белы квадрат ....... 104

ЦЕСНАЯ БРАМА. Евангельскія згадкі
Маналог другога ....... 106
Маналог падарожнага ....... 108
Маналог брамніка ....... 111
Маналог пастуха ....... 114
Маналог сейбіта ....... 117
Маналог абранага ....... 120
Маналог дойліда ....... 122

Уладзімір МАРОЗ – паэт, празаік, сцэнарыст, эсэіст, кінарэжысёр.
Нарадзіўся 11 чэрвеня 1953 года ў горадзе Косава
Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці.
Скончыў архітэктурны факультэт БПІ (1975),
Літаратурны інстытут імя А.М.Горкага ў Маскве (1983).
Працаваў на ВТА "Інтэграл", у інстытуце "Мінскпраект",
Дзяржкіно БССР, на кінастудыі "Беларусьфільм",
намеснікам галоўнага рэдактара часопіса "Бярозка".
Цяпер – вядучы рэдактар студыі "Летапіс"
Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм".
Аўтар паэтычных зборнікаў "Пяшчотны дотык" (1984),
"Голас", "Рэй" (абодва 1993), "Хутаранская зорка" (2002),
"Дабрадаць" (2006), "Шляхцянка-восень" (2012),
кніг эсэ "Беларускі храм" (2003),
"Мінск. Верхні горад" (2003), "Мінск. Плошча Перамогі" (2003)
"За брамай забытых мелодый" (2004),
"Мінск старадаўні і малады" (4 выданні – 2002, 2003, 2004, 2006),
"Магілёў" (2007) і інш.
Аўтар сцэнарыяў звыш сямідзесяці дакументальных стужак,
звернутых да гісторыі і культуры Беларусі.
Фільм "Успамін пра Міколу Равенскага"
адзначаны Дзяржаўнай прэміяй Рэспублікі Беларусь (1984).
Кінарэжысёр дакументальных фільмаў "Лазер Алфёрава" (2008),
"Міфалагемы Родзіна" (2009), "Беларусьфільм 2010" і інш.

Літаратурна-мастацкае выданне

МАРОЗ Уладзімір Вікенцьевіч

КРЫЖЫ НА РОСТАНЯХ

*Кніга вершаў*

Мастак М. У. Мароз
Мастацкі рэдактар В. Р. Мішчанка
Набор У. В. Мароз
Вёрстка Зміцера Коласа

Падпісана да друку 12.08.2014. Фармат 84x108 1/32.
Папера афсетная. Друк лічбавы.
Ум. друк. арк. 6,72. Ул.-выд. арк. 4,52.
Наклад 350 асобнікаў.

Выдавец і паліграфічнае выкананне
індывідуальны прадпрымальнік Зміцер Колас.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюдніка
друкаваных выданняў № 1/291 ад 17.04.2014.
Пр. Незалежнасці, 105-14, 220023, Мінск.